

У цудоўным дзіцячым санаторыі «Случ» падапечных лечаць, вучаць, выхоўваюць, ладзяць іх вольны час. Санаторый карыстаецца попытам у замежнікаў, шмат пуцёвак сюды набываюць расіяне. СТАР 2



Кожны з нас можа і павінен ведаць, ваду якой якасці ўжывае. Для гэтага дастаткова звярнуцца ў мясцовы цэнтр гігіены. За ўмераны кошт там будуць праведзены адпаведныя даследаванні проб. СТАР 3



Наваполацку — 55. Прыгожую дату навапалачане будуць святкаваць 8 чэрвеня, у Дзень горада. Напярэдадні карэспандэнты «Звязды» наведалі гэты малады і перспектыўны горад. СТАР 4-6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

6 чэрвеня 2013 г. ЧАЦВЕР № 102 (27467) Кошт 1500 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ПЫТАННЯМ АБАРАНАЗДОЛЬНАСЦІ І БЯСПЕКІ САДРУЖНАСЦІ — ПІЛЬНАЯ ЎВАГА

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падкрэслівае важнасць умацавання абароннага патэнцыялу СНД ва ўмовах складанай геапалітычнай абстаноўкі на сусветнай арэне. Аб гэтым ён заявіў учора на сустрэчы з кіраўнікамі дэлегацый, якія ўдзельнічаюць у пасяджэнні Савета міністраў абароны дзяржаў — удзельніц СНД, перадае БЕЛТА.**



Фота БЕЛТА.

«У гэтым годзе Беларусь старшынствуе ў Садружнасці. Таму мы надаём асаблівае значэнне кожнаму мерапрыемству, якое служыць умацаванню аўтарытэту нашага інтэграцыйнага аб'яднання і далейшаму развіццю супрацоўніцтва паміж дзяржавамі-ўдзельніцамі ва ўсіх сферах дзейнасці», — сказаў беларускі лідар.

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, цяпер у Садружнасці створаны спрыяльныя ўмовы для ўмацавання шматбаковых узаемавыгадных адносін, якія адпавядаюць нацыянальным інтарэсам кожнай з дзяржаў. Так, на нядаўнім пасяджэнні Савета кіраўнікоў урадаў прадметна і зацікаўлена абмяркоўваліся пытанні пашырэння эканамічнага супрацоўніцтва, нарошчвання аб'ёмаў узаемнага гандлю і паглыблення вытворчай кааперацыі. «Вялікая ўвага ў СНД удзяляецца пашырэнню і ўмацаванню ўзаемадзеяння ў сацыяльнай, культурнай, адукацыйнай, навуковай, інфармацыйнай і іншых галінах. Мы аб'ядноўваем намаганні ў барацьбе з міжнародным тэрарызмам, транснацыянальнай арганізаванай злачыннасцю, незаконным абаротам наркотыкаў, наступствамі тэхнагенных катастроф і стыхійных бедстваў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў Прэзідэнта, важным кансалідуючым фактарам з'яўляецца практыка палітычных кансультацый па ключавых пытаннях сусветнай палітыкі, а таксама па міжнародных праблемах, якія маюць узаемны інтарэс.

«Разам з палітычным, эканамічным і гуманітарным складальнікамі супрацоўніцтва вышэйшымі органамі Садружнасці ўдзяляецца самая пільная ўвага пытанням абараназдольнасці і бяспекі нашых краін. У цяперашняй складанай геапалітычнай абстаноўцы на сусветнай арэне гэта сфера інтэграцыі набывае асаблівую значнасць для стабільнасці дзяржаў і ўстойлівага развіцця Садружнасці», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. СТАР 2

## МУЖЧЫНСКІ КЛОПАТ АБ ПРЫГОЖЫМ



Рабочыя мінскага «Зелянбуда» рыхтуюць шарападобную клумбу ў Кастрычніцкім раёне сталіцы.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір РАФАЛЬСКІ, начальнік упраўлення нагляду і прафілактыкі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях:**

***«У беларускіх школах могуць быць уведзены залікі па асновах бяспекі жыццядзейнасці. На жаль, у школах гэты кампанент цяпер не з'яўляецца абавязковым, але наша ведамства настойвае на абавязковасці вывучэння АБЖ. Ёсць даручэнне намесніка прэм'ер-міністра Анатоля Тозіка Міністэрству адукацыі прапрацаваць гэтае пытанне. Ідзе работа ў гэтым кірунку. Упэўнены, што ў найбліжэйшай будучыні кампанент асноў бяспекі жыццядзейнасці будзе ўключаны як абавязковы ў вучэбную праграму, і па ім будуць здавацца няхай нават не экзамены, а залікі».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 06.06.2013 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 8700,00 |
| Еўра | 11380,00 |
| Рас. руб. | 273,50 |
| Укр. грыўня | 1066,76 |

■ Прамая лінія

## ГАРАЧАЯ ПАРА... ПРЫЗЫЎНАЯ

**Сёлетні май выдаўся незвычайна гарачым. У тым ліку і на падзеі. Асабліва для тых бацькоў, якія адправілі сваіх сыноў служыць у войска. Большасць з іх хвалюе, у якіх умовах будуць праходзіць службу іх дзеці. А гэта каля 9 тысяч юнакоў, што некалькі дзён таму пакінулі родныя хаты і апранулі ваенную форму.**

**Усяго вясной на прызыўныя камісіі было выклікана больш за 70 тысяч грамадзян. Праз паўгода некаторыя з іх таксама папоўняць армейскія шэрагі. Самы час даведацца, куды яны могуць трапіць на службу, ці магчыма гэта пры пэўнай хваробе і якім чынам можна атрымаць адтэрміноўку?**

На гэтыя і іншыя пытанні чытачоў «Звязды» падчас «прамой лініі» адказвалі **намеснік начальніка ўпраўлення — начальнік аддзела прызыву на вайсковую службу галоўнага арганізацыйна-мабілізацыйнага ўпраўлення Генеральнага штаба Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь Андрэй МУРАШОЎ і начальнік 1-га аддзела — намеснік старшыні Цэнтральнай ваеннай урачэбнай камісіі Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь Аляксандр ГАРБАРЧУК.**

**— Як юнаку трапіць на службу менавіта ў тую вайсковую часць, у якую ён хоча?**

**Максім ЮШКЕВІЧ,** *г. Дзяржынск*

**Андрэй МУРАШОЎ:** — Пасля праходжання медыцынскага агляду пра сваё жаданне быць накіраваным у пэўную вайсковую часць прызыўніку неабходна заявіць ці супрацоўнікам ваеннага камісарыяту, ці членам прызыўной камісіі. Калі стан здароўя юнака не перашкаджае яму праходзіць службу ў гэтай часці і ён адпавядае ўсім патрабаванням, не павінна ўзнікнуць праблем, каб туды трапіць. Як правіла, калі малады чалавек па ўсіх крытэрыях падыходзіць для службы ў канкрэтнай вайсковай часці, то супрацоўнікі ваенкаматаў ніколі не перашкаджаюць, каб ён пайшоў служыць туды, куды хоча. Наадварот, яны ідуць насустрач.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Ці можна вайскоўцу па ўласным жаданні змяніць род войскаў ці нават гарнізон, у якім ён праходзіць службу?**

**Людміла СТРЫБУЦЬ,** *г. Вілейка*

**Андрэй МУРАШОЎ:** — Гэта магчыма толькі пры ўмове, калі ў вайскоўца ўзніклі пэўныя цяжкасці, звязаныя з сямейным становішчам. Ёсць сітуацыі, абумоўленыя заканадаўствам, калі грамадзянін можа быць пераведзены бліжэй да месца жыхарства сваёй сям'і. Падобныя пытанні вырашаюцца індывідуальна. Падкрэслю, што гэта адзінкавыя выпадкі. Увогуле, заканадаўствам не прадугледжаны перавод па службе па жаданні салдата. Яшчэ такое магчыма ў выпадках расфарміравання вайсковай часці. СТАР 3

### ДОБРАЯ НАВІНА ДЛЯ ПАШТАВІКОЎ!

Газета «Звязда» рэгулярна праводзіць не толькі розыгрыш прызоў сярод падпісчыкаў. Конкурс «Прыз — руплівому паштальёну!» аб'яўлены намі 4 сакавіка 2013 года. Згодна з умовамі конкурсу, прызамі будуць узнагароджаны тры лепшыя паштальёны з кожнай вобласці і горада Мінска, у якіх рост колькасці падпісчыкаў на другое паўгоддзе 2013 года (але не менш чым на тры месяцы) складзе 10 і больш чалавек. Самыя руплівыя атрымаюць грашовую ўзнагароду ў памеры 1 500 000, 1 100 000, 700 000 беларускіх рублёў за першае, другое і трэцяе месца адпаведна. Імёны пераможцаў стануць вядомыя 12 жніўня 2013 года. Падрабязнасці конкурсу вы можаце даведацца ў сваіх аддзяленнях паштовай сувязі.

Працягваецца і наш пастаянны конкурс «Лепшаму кіяскёру — звяздоўскі прыз!». У гэты раз узнагароду атрымаюць кіяскёры або работнікі спецыялізаваных гандлёвых пунктаў «Белсаюздруку» і «Аблсаюздруку» па выніках рэалізацыі газеты «Звязда» ў першым паўгоддзі 2013 года.

Удзельнічайце ў нашых акцыях і атрымлівайце прызы і падарункі!

■ На слыху

## НЕПРЫВАТЫЗАВАНАЕ ЖЫЛЛЁ ТРАПІЦЬ У РАНГ КАМЕРЦЫЙНАГА НЕ РАНЕЙ ЧЫМ ПРАЗ ГОД

**Як вядома, кіраўніцтвам жыллёва-камунальнай гаспадаркі быў падрыхтаваны дакумент, згодна з якім прадугледжваецца праз пэўны час перавод неприватызаванага жылля ў камерцыйнае. Нагадаю, што пасля таго, як гэта адбудзецца, жыхары кватэр дзяржаўнага жыллёвага фонду будуць плаціць не толькі камунальныя паслугі, але і пэўныя сумы за карыстанне жылымі памяшканнямі.**

Гэтая навіна ўзрушыла жыхароў непрыватызаваных кватэр. Больш за астатніх пачалі хвалявацца тыя старыя людзі, якія раней не паспелі, а зараз рэальна не могуць дазволіць сабе заплаціць (часам даволі буйныя сумы грошай) за прыватызацыю атрыманага ад дзяржавы жылля. СТАР 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У МАСКОЎСКІМ МЕТРО ПАЦЯРПЕЛІ 15 ЧАЛАВЕК, ЭВАКУІРАВАНЫ 4,5 ТЫСЯЧЫ



У маскоўскім метро адбыўся пажар, выратавальнікі вывелі з-пад зямлі 4,5 тыс. чалавек, пацярпелі 15 чалавек, двое з іх дзеці, паведамляюць інфармагенцтвы. З-за ўзгарання кабеля быў прыпынены рух цягнікоў ад станцыі «Парк Культуры» да «Камсамольскай» Сакольніцкай лініі. Састаў, які апынуўся ў тунэлі ў момант надзвычайнага здарэння, даставілі на станцыю «Бібліятэка імя Леніна». Прычыны і абставіны здарэння высвятляюцца.

### У ЛАТВІІ ПАЧАЎСЯ ЗБОР ПОДПІСАЎ У ПАДТРЫМКУ РЭФЕРЭНДУМУ СУПРАЦЬ УСТУПЛЕННЯ Ў ЕЎРАЗОНУ

Латвійскае таварыства «За лат, супраць еўра» пачало збор подпісаў у падтрымку правядзення ўсенароднага рэферэндуму па пытанні захавання латвійскай нацыянальнай валюты. Згодна з латвійскім заканадаўствам, на першым этапе неабходна сабраць 30 000 натарыяльна завераных подпісаў, а затым Цэнтральная выбарчая камісія арганізуе збор подпісаў. Свой удзел у кампаніі ўжо пацвердзілі некаторыя грамадскія арганізацыі краіны. Яны правядуць збор подпісаў сярод сваіх членаў і акажуць таварыству «За лат, супраць еўра» матэрыяльную падтрымку. У сакавіку 2010 года ўрад Латвіі прыняў рашэнне, што краіна ўвядзе еўра з 1 студзеня 2014 года. Для гэтага ёй неабходна адпавядаць Маастрыхцкім крытэрыям — базавым патрабаванням ЕС па інфляцыі, узроўні дэфіцыту бюджэту і іншых макраэканамічных паказчыках. Згодна з нядаўнімі апытаннямі грамадскай думкі, больш за 50% жыхароў Латвіі негатыўна ставяцца да ўвядзення еўра ў краіне. Раней сейм Латвіі адхіліў прапанаваны апазіцыяй законапраект, згодна з якім рашэнне пра тэрміны ўвядзення ў краіне еўра павінна быць прынята на агульнанацыянальным рэферэндуме.

### У ЧЭХІІ З-ЗА ПАВОДКІ ЗАКРЫТЫ НЕКАТОРЫЯ ТУРАБ'ЕКТЫ

У сувязі з маштабнай паводкай у Чэхіі для наведвання турыстамі і мясцовымі жыхарамі закрыты шэраг аб'ектаў. У Празе гэта Карлаў мост, парк Кампа і прылеглыя вуліцы, заапарк, некаторыя музеі і галерэі, размешчаныя ўздоўж ракі Влтавы. Сур'ёзная сітуацыя складваецца на іншых папулярных турыстычных маршрутах — да прыкладу, такіх, як горад Чэшскі Крумлаў і яго ваколлі. Разам з тым, масавай эвакуацыі насельніцтва і замежных турыстаў не ажыццяўляецца. Паветраная сувязь не перарвана, аэрапорты краіны працуюць у звычайным рэжыме. У краіне, за выключэннем Пардубіцкага і Карлаварскага краёў, захоўваецца рэжым надзвычайнага становішча.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### САМЫЯ ШЧАСЛІВЫЯ — ШВЕЙЦАРЦЫ І СКАНДЫНАВЫ

Больш за ўсіх сваім жыццём задаволены швейцарцы — да такой высновы прыйшлі даследчыкі Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця, якая апублікавала абноўлены індэкс лепшага жыцця. У даследаванні прынялі ўдзел 36 краін. Важнымі крытэрыямі пры складанні рэйтынгу сталі даход на душу насельніцтва, узровень адукацыі, працягласць жыцця і стан экалогіі.

Другое месца заняла Нарвегія, якая аказалася сярод лепшых краін па якасці вады і трапіла ў дзясятку лепшых па якасці паветра. Сярэдняя працягласць жыцця ў краіне — больш за 81 год.

Трэцяе месца ў Ісландыі — амаль усе апытаныя яе жыхары заявілі, што ў выпадку неабходнасці могуць разлічваць на падтрымку сваякоў і сяброў нават за мяжой. Ісландцы жывуць у сярэднім амаль 83 гады.

Чацвёртае месца дасталася Швецыі. У гэтай краіне — самае чыстае навакольнае асяроддзе, а працягласць жыцця складае каля 82 гадоў.

На пятым месцы аказалася Данія. Сярэдняя працягласць жыцця датчан — каля 80 гадоў. А ўрад каралеўства выдаткоўвае значныя грошы, каб гарантаваць дабрабыт сваіх жыхароў.

КОРАТКА

У Беларусі тэлевізійнае вяшчанне ў лічбавым фармаце ўжо даступна на 96,97% тэрыторыі Беларусі.

У Гродзенскай вобласці вынесены першыя забароны на купанне. У возеры горада Шчучын і возеры Гурнофель Шчучынскага раёна купанне прыпынена да атрымання вынікаў лабараторных даследаванняў, якія пацвярджаюць бяспеку вады.

Дзень малочнай каровы пройдзе сёння ў ААТ «Гастэлаўскае» ў рамках міжнароднай спецыялізаванай выставы «Белагра-2013».

Першы з беларусаў бронзавую ўзнагароду юбілейнага 40-га чэмпіянату Еўропы забяспечыў сабе вопытны баксёр Віктар Зуеў (вагавая катэгорыя звыш 91 кг). У чвэрцьфінале ён перамог украінца Ягора Пляваку.

## ШТО ВЫ ГАТОВЫ ЗРАБІЦЬ ДЛЯ ТАГО, КАБ СВЕТ СТАЎ ЛЕПШЫМ?



**Таццяна ПІЛІПЧУК, малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута мікрабіялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, г. Мінск:**

— Я імкнуся дапамагаць людзям, але часам яны пачынаюць «садзіцца» табе «на шыю» і скідваць усе праблемы на цябе. Тады задумваешся, ці варта ўвогуле было дапамагаць.

А яшчэ мне бывае вельмі сумна, калі бачу бяздомных жывёл. Я нават спрабавала пайсці ў валанцёры (па доглядзе кошак), але не змагла доўга там пратрымацца. Таксама вельмі сумна глядзець на людзей з фізічнымі і псіхічнымі адхіленнямі. Людзі, якія іх даглядаюць, — героі. Часта бачыш бедных пажылых людзей, інвалідаў на калясках... Яны прадаюць свае рэчы альбо просяць міласціну. Вядома, стараюся даць хоць нейкую суму грошай, але яна мізэрная ў суадносінах з цэнамі на прадукты. Напэўна, у маіх сілах толькі дапамагаць маленькімі «порцыямі»: камусьці ўзняць настрой, камусьці саступіць месца, падбадзёрыць словамі, усміхнуцца, пастарацца дапамагчы матэрыяльна, няхай і невялікай сумай.



**Аляксандр ШУПЕНЬКА, рэжысёр, г. Маладзечна:**

— Каб свет стаў лепшым, я гатовы ствараць. Ствараць «правільныя» мастацкія творы. Мне блізкая тэма кіно, таму я пачаў бы менавіта з яго. Сёння так мала добрага кіно, і ў свядомасці «засела» фраза менавіта пра «старое добрае кіно» — крыху наіўнае, але якое хочацца пераглядаць шмат разоў.

У сучасным кінематографе практычна ўсе галоўныя героі, з якіх звычайна бяруць прыклад, далёкія ад маральнай дасканаласці. Але ж кіно — адзін з мацнейшых інструментаў пры выхаванні чалавека. І вельмі шкада, што сёння імкнуцца быць падобнымі да вампіраў ды піратаў, і аніяк не да высакародных рыцараў...



**Марыя СТРАХАЛЕТ, студэнтка БДУКМ, г. Мінск:**

— Чамусьці ў адказ на гэтае пытанне ў галаву прыходзяць не канкрэтныя думкі кшталту стварэння якога-небудзь дабрачыннага фонду ці яшчэ чаго-небудзь падобнага, а нейкія абстрактныя. Я, пэўна, гатова падзяліцца з усім светам сваёй усмешкай! Можа, у чалавека, якога я ніколі не бачыла і, магчыма, не ўбачу, але які будзе ісці мне насустрач па вуліцы, здарылася нешта нядобрае, ці проста кепскі настрой... Дык ён тады ўбачыць маю ўсмешку і адразу зразумее, што не ўсё так дрэнна, як яму здаецца! Бо мне бывае вельмі крыўдна за нашых людзей, што яны вялікую частку праблем прыдумваюць сабе самі на пустым месцы, замест таго, каб высока ўзняць галаву ды ісці наперад з усмешкай! І свет наш ад гэтага адразу зрабіўся б трохі лепшым!

**Падрыхтавала Дзіяна СЕРАДЗЮК.**

## ПЫТАННЯМ АБАРАНАЗДОЛЬНАСЦІ І БЯСПЕКІ САДРУЖНАСЦІ — ПІЛЬНАЯ ЎВАГА

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Прэзідэнт адзначыў, што новы імпульс удасканаленню ўзаемадзеяння краін Садружнасці ў ваеннай сферы надала рэалізацыя Канцэпцыі ваеннага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД да 2015 года. Гэта Канцэпцыя — лагічнае прадаўжэнне ліній на захаванне і развіццё існуючых і пошук новых запатрабаваных формаў сумеснай дзейнасці. Яна фактычна вызначае асноўныя контуры будучай мадэлі шматбаковага супрацоўніцтва ў сферы бяспекі. «Цяпер на першым плане знаходзяцца пытанні менавіта практычнага супрацоўніцтва. Даручэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў Садружнасці павінны выконвацца аператыўна і эфектыўна. Падпісанне дакументаў — гэта толькі першы крок, гэта значыць, пачатак вашай штодзённай работы. Неабходна на практыцы адпрацоўваць механізмы супрацоўніцтва, шукаць эфектыўныя шляхі процідзеяння ўзнікаючым пагрозам, а іх, згадзіцеся, па перыметры нават нашых граніц хапае. Я не кажу ўжо аб унутраных пагрозах, якія маюць інтарэс і для ваенных ведамстваў», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што прымаемыя Саветам міністраў абароны намаганні па ўдасканаленні базавых асноў ваеннага супрацоўніцтва пастаянна знаходзяць падтрымку сярод вышэйшых статутных органаў арганізацыі.

Паводле слоў Прэзідэнта, прыкладам плённага супрацоўніцтва і цеснай інтэграцыі можа служыць узаемадзеянне Беларусі і Расіі ў Саюзнай дзяржаве. «Мы практычна стварылі адзіную армію, і, калі не дай бог што, мы тут абсалютна адзіныя і ведаем, што рабіць. Мы гэтага не баімся, супрацоўнічаем такім чынам не адзін дзясятак гадоў, і мы ніякай незалежнасці не страцілі. Прыкладам гэтага можа служыць стварэнне адзінага комплексу супрацьпаветранай абароны. Гэта супрацоўніцтва падлягае яшчэ больш глыбокай інтэграцыі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«У нас, беларусаў і расіян, адзін ад аднаго абсалютна няма ніякіх сакрэтаў. Калі ў нас нечага не хапае і нешта не атрымліваецца, мы ведаем, і ў Расіі ёсць праблемы, мы заўсёды проста патрабуем, каб Расія звяртала ўвагу на тое, што адбываецца ў Беларусі, — адзначыў Прэзідэнт. — Мы просім і патрабуем ад іх пастаўкі новых узбраенняў, якія існуюць у расійскай арміі. Гэта дае нам права як раўнапраўнаму партнёру з нашымі братамі-расіянамі дзейнічаць у адзіным ключы. У нас адзіная абаронная прастора».

«Пажадана, каб хутчэй развіваліся інтэграцыйныя працэсы, хоць бы да ўзроўню АДКБ. Гэта быў бы сур'ёзны крок, але пакуль мы робім тое, што можам», — разважаў Аляксандр Лукашэнка.

Міністр абароны Расіі Сяргей Шайгу ад імя Савета міністраў абароны выступіў са словам у адказ. Ён адзначыў, што бакам трэба яшчэ шмат зрабіць, каб выйсці на патрэбны ўзровень бяспекі ў СНД.

Правядзенне пасяджэння Савета міністраў абароны ў Мінску ён назваў знакавай падзеяй у развіцці цеснага партнёрскага супрацоўніцтва ў ваеннай сферы.

***Удзельнікам Міжнароднай канферэнцыі «Хрышчэнне Русі ў лёсах народаў Беларусі, Расіі, Украіны: выбар цывілізацыйнага шляху»***

**Паважаныя сябры!**

Сардэчна віншую вас з пачаткам работы Міжнароднай канферэнцыі «Хрышчэнне Русі ў лёсах народаў Беларусі, Расіі, Украіны: выбар цывілізацыйнага шляху».

Больш за тысячу гадоў хрысціянства фарміруе агульныя для ўсіх усходніх славян этычныя і эстэтычныя ідэалы, з'яўляецца асновай маральных і культурных традыцый. Сёння яно адыгрывае вялізную ролю ва ўмацаванні маральных асноў, пропаведзі адзінства, міралюбнасці і ўзаемадапамогі.

Шматгранная дзейнасць Праваслаўнай Царквы нязменна знаходзіць водгук у беларускім грамадстве. Канструктыўнае супрацоўніцтва дзяржавы і Беларускага Экзархата дазваляе сумесна рэалізоўваць гуманітарныя праекты, рэстаўрыраваць унікальныя старажытныя святыні і будаваць новыя храмы.

Упэўнены, правядзенне канферэнцыі з удзелам шырокага прадстаўніцтва вучоных і духавенства паслужыць справе далейшага збліжэння славянскіх народаў, дазволіць усвядоміць вялікую кансалідуючую сілу хрысціянства, яго творчую і культурастваральную ролю.

Жадаю ўдзельнікам канферэнцыі здароўя, поспехаў у духоўнай і навуковай дзейнасці на карысць нашых народаў.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## ГІСТОРЫЯ ВЕРЫ

**6-7 чэрвеня ў Мінску пройдзе Міжнародная навуковая канферэнцыя «Хрышчэнне Русі ў лёсах народаў Беларусі, Расіі і Украіны: выбар цывілізацыйнага шляху».**

Гэта адна з першых падзей, якія адкрываюць серыю міжнародных святочных мерапрыемстваў у гонар 1025-годдзя Хрышчэння Русі.

У канферэнцыі возьмуць удзел больш за 450 прадстаўнікоў акадэмічнай навукі і грамадскасці Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, а таксама тэолагі, прадстаўнікі Рускай Праваслаўнай Царквы, журналісты, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, грамадскія дзеячы.

Форум арганізаваны Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі і Беларускай Праваслаўнай Царквой.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## РАСІЙСКАЯ АВІЯБАЗА Ў БЕЛАРУСІ БУДЗЕ,

### аэрадром для яе пачнуць падбіраць ужо сёння

**Аб гэтым заявіў міністр абароны Расійскай Федэрацыі Сяргей Шайгу па выніках працы 64-га пасяджэння Савета міністраў абароны краін СНД, што прайшло ўчора ў беларускай сталіцы.**

Усяго было разгледжана больш за 20 пытанняў. Сярод іх — і абмеркаванне міжнароднага становішча, і пытанні забеспячэння абараназдольнасці краін СНД і ўзаемадзеяння іх узброеных сіл. І такое даволі цікавае пытанне, як удзел інжынерных войск у справе гуманітарнага размініравання.

Што тычыцца надзённай канкрэтыкі, то міністры дамовіліся аб правядзенні ў жніўні—верасні гэтага года сумеснага вучэння войск супрацьпаветранай абароны «Баявая садружнасць-2013». Вучэнні адбудуцца як у раёнах пастаяннай дыслакацыі часцей і злучэнняў, так і з баявымі стрэльбамі на палігонах Ашулук (Расія) і Сарышаган (Казахстан).

Міністры абароны мяркуюць аб'явіць 2017 год у СНД Годам абаронцаў Айчыны.

Звярнуліся яны і да праблемы ўшанавання ўдзельнікаў вайны ў Афганістане. У іх гонар да 25-й гадавіны вываду савецкіх войск плануецца выпусціць спецыяльны медаль.

Пра гэта паведаміў міністр абароны Рэспублікі Беларусь Юрый Жадобін на выніковай прэс-канферэнцыі.

Безумоўна, пытанні двухбаковага ваеннага супрацоўніцтва Расіі і Беларусі, дзе на працягу многіх гадоў назіраецца добры плён, вызвалі асаблівую цікавасць. «Ці магчымы тут якія-небудзь карэктывы?» — спыталі ў міністра абароны Расіі. «Калі і будуць карэктывы, — адказаў той, — то толькі не ў бок скарачэння, а наадварот, — у бок пашырэння і развіцця. Гэта і па пытаннях адукацыі, падрыхтоўкі ваенных кадраў, новых сістэм узбраення, і па пастаўках тэхнікі. «Мы працягваем дзейнічаць па рашэннях нашых вярхоўных галоўнакамандуючых, згодна з іх дамовамі і тым планам, які зацверджаны дастаткова даўно», — удакладніў ён.

А наконт плануемага размяшчэння ў нашай краіне расійскай авіябазы, пра што генерал арміі паведаміў падчас свайго папярэдняга візіту ў Беларусь, тут міністр абароны Расіі спачатку адказаў дыпламатычна: маўляў, працягнем рухацца ў зададзеным кірунку. А потым дадаў, што ўжо 6 мая ў Беларусі пачне працу рэкагнасцыровачная група на чале з камандуючым ваенна-паветранымі сіламі Расіі. Іх задача — за два-тры тыдні падабраць належны аэрадром. Дзе ўжо сёлета павінна з'явіцца расійская авіяцыйная камендатура і іх першыя баявыя самалёты.

**Віктар ВІКЕНЦЬЕЎ.**

# У СНД ХОЧУЦЬ ПАБУДАВАЦЬ «ГОРАД СОНЦА»?

**Шчасце стала эканамічным паказчыкам. Нарэшце. Тамаза Кампанэла, аўтар знакамітай утопіі «Горад Сонца» быў бы вельмі рады, калі б жыў у наш час. Ёсць усё ж такі шанц на тое, што прыйсці да дасканалага грамадства магчыма. На такую думку мяне натхніла VI пасяджэнне Экспертнай групы па ключавых нацыянальных паказчыках Савета кіраўнікоў найвышэйшых органаў фінансавага кантролю (НОФК) дзяржаў-удзельніц СНД, якое адбылося ўчора ў нашай сталіцы.**

### Кантроль эфектыўнасці

Калі б не было статыстыкі, мы б і не ведалі, як добра працуем. Так гаворыцца ў адным добрым старым фільме. Але ж сапраўды: як вызначыць, наколькі эфектыўна працуе эканоміка краіны, ці выконвае ўсе сацыяльныя абавязацельствы дзяржава, ці ёсць прагрэс? Для гэтага неабходна вызначыць пэўныя паказчыкі ды падлічыць іх значэнне. Але якія паказчыкі? Для ўсіх аднолькавыя ці кожнай краіне асаблівыя? Для адказу на гэтыя пытанні і выпрацоўкі адпаведных крытэрыяў ацэнкі пяць гадоў таму і была створана Экспертная камісія. «Наша задача паспрабаваць прапанаваць асноўныя паказчыкі, крытэрыі, зразумелыя ў першую чаргу падаткаплацельшчыкам, каб прастора, у якой развіваюцца нашы краіны, была зразумелай і спрыяла не імкненню дзесьці штосьці ўкрасці ці жаданню перакласць на суседа цяжкасці, а наадварот, аб'яднанню намаганняў на Еўразійскай прасторы, каб быў агульны станоўчы эфект», — заявіў **Аляксандр ПІСКУНОЎ, аўдытар Падліковай палаты РФ, кіраўнік Экспертнай групы**. «Група створана, каб мы маглі ацэньваць узровень прагрэсу ў нашых краінах, вызначаць, у якім стане знаходзіцца кожная з краін СНД», — дадаў Дзмітрый Санько, начальнік галоўнага аналітычнага ўпраўлення Камітэта дзяржкантролю Беларусі.

**Аляксандр ЯКАБСОН, старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю,** звярнуўся да ўдзельнікаў пасяджэння са словамі: «Мы цэнім і надаём вялікую ўвагу дзейнасці Экспертнай групы. Шмат зроблена, але наперадзе яшчэ вялікая і напружаная праца для дасягнення канчатковай мэты. Таму так важна наладжваць абмен вопытам. Вопыт заўсёды быў лепшым настаўнікам». Аднак ён нагадаў, што адна з асноўных задач любой справы — гэта сувязь тэорыі і практыкі: «Важна, каб вынікі вашай працы знайшлі практычнае прымяненне, а не засталіся толькі на паперы».

### Грошы — у шчасце

А планы і мэты ў групы вельмі грандыёзныя. Шчыра кажучы, мне б хацелася, каб усе яны рэалізаваліся і менавіта ў такой форме, якая агучвалася Аляксандрам Піскуновым: «Мы ўжо шэсць гадоў жывём ва ўмовах крызісу, і сітуацыя не паляпшаецца. Свет увогуле ліхаманіць у сферы экалогіі, палітычнай і сацыяльнай сферах. Аб'ектыўная ацэнка таго, што адбываецца, і выбар правільнага шляху — вельмі цяжкая задача. Мы прадстаўляем падаткаплацельшчыкаў, і хочацца, каб і чаканні грамадства, і абавязацельствы ўлады, па магчымасці, супадалі, каб мы не проста сачылі за тым, што рубель выдаткаваны па правілах, а за тым, каму ад гэтага стала лепш жыць. Каб не было так, што гузікі прышыты намертва, а пінжак насіць нельга», — працытаваў Аркадзя Райкіна кіраўнік групы. У метафарычным выглядзе Аляксандр Піскуноў ахарактарызаваў галоўную задачу так: «Пабудаваць сацыяльна-эканамічны таматограф, які дазваляў бы ўладзе і грамадству бачыць, у якім стане рэальна знаходзяцца, чым валодаюць, куды нас кліча ўлада і хто ад гэтага становіцца больш шчаслівым».

У пасяджэнні прынялі ўдзел дэлегаты з сямі краін: Беларусі, Расіі, Малдовы, Таджыкістана, Кіргізіі, Казахстана і Арменіі.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

### Даведка «Звязды»

*Экспертная група створана ў 2008 годзе. Яе місія заключаецца ў садзейнічанні ўкараненню і маніторынгу сістэм ключавых нацыянальных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця на нацыянальным і міжнародным узроўнях, а таксама развіццю аўдыту эфектыўнасці ў краінах СНД.*

# НЕПРЫВАТЫЗАВАНАЕ ЖЫЛЛЁ...

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Як пракаментавала гэтую сітуацыю **начальнік аддзела юрыдычнай работы і кадраў Мінжылкамунгаса Наталля КУХАРЧЫК**, у падрыхтаваным дакуменце прадугледжаны механізм пераводу дзяржаўнага жылля не толькі ў камерцыйны фонд, але і ў ранг сацыяльнага жылля. Гэта тычыцца сацыяльна неабароненых катэгорый насельніцтва — напрыклад, адзінокіх пенсіянераў з мізэрнымі даходамі. «У гэтым выпадку карыстальнікі дзяржаўнага жылля змогуць у любы момант звярнуцца з адпаведнай заявай да мясцовых структур жылкамунгаса і перавесці сваю кватэру ў ранг сацыяльнага», — паведаміла спецыяліст. А вось плата за карыстанне сацыяльным жыллём у нашым заканадаўстве не прадугледжана.

Разам з тым, тут трэба разумець, што пасля пераводу жылога памяшкання ў ранг сацыяльнага жылля такую кватэру потым прыватызаваць будзе ўжо немагчыма. Калі потым у жыхароў сацыяльнага жылля «адшукаюцца» сваякі, то карыстацца ці валодаць такімі кватэрамі яны не змогуць.

Некалькі слоў аб мяркуемым памеры платы за карыстанне непрыватызаваным жыллём. Зараз плата за карыстанне жылымі памяшканнямі арэндных дамоў складае 20 тысяч рублёў за квадратны метр агульнай плошчы.

Такія базавыя тарыфы арэнднай платы карэктуюцца памяншальнымі ці павелічальнымі каэфіцыентамі, якія вызначаюцца аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам. Максімальны каэфіцыент гэтага арэнднага тарыфу ў памеры 1,5 зараз выкарыстоўваецца ў Мінску.

Дарэчы, плата за карыстанне дзяржаўным жыллёвым фондам для людзей, якія там жылі да пераходу такіх кватэр у камерцыйны статус, будзе значна меншай за базавы тарыф у арэндных дамах, упэўнена спадарыня Кухарчык. Зараз праектам новага дакумента прапануецца выкарыстоўваць да існуючых базавых тарыфаў памяншальны каэфіцыент 0,1. Але і гэта яшчэ не факт. Канчатковыя рашэнні аб памерах такой платы будуць прымаць мясцовыя органы ўлады ў залежнасці ад велічыні даходаў жыхароў непрыватызаваных кватэр у кожным асобным рэгіёне.

Днямі па гэтым балючым для людзей пытанні выказаўся **першы намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Аляксандр ЦЕРАХАЎ**. Ён адзначыў, што хвалявацца цяпер зарана, бо «перавод непрыватызаванага жылля ў камерцыйнае будзе ажыццяўляцца толькі праз год пасля прыняцця адпаведнага ўказа». Праектам новага дакумента прадугледжаны яшчэ некалькі момантаў, якія знівеліруюць праблемы пры гэтым пераходзе, удакладніў намеснік міністра.

Усё гэта так, але... Зараз у жыллёвых аддзелах асобных раёнаў буйных гарадоў назіраюцца чэргі. Людзі не толькі пачалі актыўна займацца прыватызацыяй свайго жылля, але і патрабуюць тлумачэнні аб мяркуемых зменах. Напрыклад, зараз асобныя старыя толькі «прапісаны» ў сваім непрыватызаваным жыллі, а фактычна жывуць у дзетак. Зараз такія свабодныя кватэры здаюцца ў арэнду іншым фізічным асобам. Пасля пераводу непрыватызаваных кватэр у ранг камерцыйнага ці сацыяльнага жылля іх здача ў наём трэцім асобам стане ўжо немагчымай. Бываюць выпадкі, калі ў кватэры бабулі зарэгістраваны яе ўнук, які там не жыве, але разлічвае на гэтую жылплошчу ў будучыні. Ці будуць у такога ўнука нейкія правы на непрыватызаваную кватэру бабулі, калі дзяржаўнае жыллё трапіць у ранг камерцыйнага ці сацыяльнага? Падобных пытанняў даволі шмат.

А вось больш падрабязна каментаваць будучы ўказ да яго прыняцця ніхто з чыноўнікаў не хоча. Можа, гэта і сапраўды пакуль некарэктна...

**Сяргей КУРКАЧ.**

### МАЙ НА ЎВАЗЕ

***Кошт прыватызацыі кватэр дзяржаўнага жыллёвага фонду напрамую залежыць ад «узросту» дома.*** **Галоўным фактарам тут з'яўляецца не раён «прапіскі» і канструктыўныя асаблівасці жылога дома, а менавіта дата яго пабудовы.**

**Так, калі дом у сталіцы быў здадзены ў эксплуатацыю прыкладна ў 1970-я гады, то прыватызацыя стандартнай двухпакаёвай кватэры будзе каштаваць новаму ўласніку да 5 тысяч долараў. А вось прыватызацыя такой кватэры ў жылым доме 1990-х гадоў абыдзецца не менш чым у 10—15 тысяч долараў.**

**Зараз у алгарытме прыватызацыі жылля прысутнічае і варыянт аплаты ў растэрміноўку на працягу 40 гадоў. Аднак не менш як 10 працэнтаў ад усёй сумы прыватызацыі неабходна заплаціць адразу.**

**Сёння дзяржаўны жыллёвы фонд Беларусі складае каля 390 тысяч жылых памяшканняў. Гэта не толькі непрыватызаванае жыллё, але і службовыя, спецыяльныя і іншыя кватэры. Днямі кіраўніцтва краіны вырашыла кардынальна «разабрацца» са службовым жыллём, якое вырашана перавесці ў катэгорыю арэнднага.**

## АДНАВІЦЬ ДАВЕР ПАМІЖ БЕЛАРУССЮ І АБСЕ

**Міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей лічыць візіт у Беларусь прадстаўніка АБСЕ па пытаннях свабоды СМІ Дуны Міятавіч важным для аднаўлення даверу паміж беларускім бокам і офісам АБСЕ. Аб гэтым кіраўнік беларускага МЗС заявіў учора на сустрэчы з прадстаўніком АБСЕ па пытаннях свабоды СМІ Дуньяй Міятавіч, перадае БЕЛТА.**

Уладзімір Макей падкрэсліў, што Беларусь не спыняла супрацоўніцтва з офісам АБСЕ. «Вы ведаеце аб нашых праблемах у адносінах з ЕС. Аднак, нягледзячы на праблемы, мы гатовы да супрацоўніцтва з вашым офісам», — сказаў ён. Міністр звярнуў увагу на насычаную праграму візіту Дуны Міятавіч у Беларусі, якая дала магчымасць ёй лепш даведацца аб сітуацыі ў краіне. «Вы тут ужо тры дні, сустракаліся з рознымі людзьмі і чулі розныя меркаванні. У вас ёсць магчымасць адэкватна ацаніць сітуацыю ў Беларусі», — сказаў ён. Уладзімір Макей пацікавіўся ўражаннямі Дуны Міятавіч і адзначыў, што ў бакоў дастаткова пытанняў для абмеркавання.

У сваю чаргу прадстаўнік АБСЕ па пытаннях свабоды СМІ падзякавала беларускаму боку за адкрытасць. «Для мяне былі адкрыты ўсе дзверы. Мне важна чуць усе галасы і меркаванні», — адзначыла яна.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

### ПАСПЕЎ НА ДАПАМОГУ

**Жыхар вёскі Перадзельск Пружанскага раёна вынес суседку з дома, ахопленага полымем.**

Слесар Пружанскага райаграсэрвісу Антон Неміровіч заўважыў дым над домам суседкі і адразу заспяшаўся на дапамогу. Мужчына бясстрашна ўвайшоў у дом і знайшоў на падлозе гаспадыню — 77-гадовую пенсіянерку. Ён вынес жанчыну на руках. Ёй нават шпіталізацыя не спатрэбілася, хапіла першай медыцынскай дапамогі. Выратавальнікі тым часам патушылі пажар.

**Яна СВЕТАВА.**

### ШКОЛЬНІКІ ВАРЫЛІ «НАРКАТУ»?

**У сталіцы 16-гадовы падлетак атрымаў апёкі пры спробе прыгатаваць наркатычнае рэчыва.**

Пра здарэнне стала вядома ад урача хуткай дапамогі: у бальніцу паступіў падлетак з апёкамі полымем верхніх дыхальных шляхоў, твару, шыі і спіны (15 працэнтаў паверхні цела). Навучэнец адной са сталічных школ атрымаў гэтыя апёкі з-за ўспышкі пароў ацэтону на кухні ў кватэры па вуліцы Ротмістрава. Мяркуецца, што пацярпелы і яго сябар, асоба якога ўстанаўліваецца, спрабавалі прыгатаваць наркатычнае рэчыва. У момант здарэння ў суседнім пакоі знаходзілася 66-гадовая бабуля хлопца. З ёй і дзедам і пражываў падлетак.

### ЗАГІНУЛІ ЎСЕ, ХТО ЕХАЎ У «АЎДЗІ»

**Чацвёра маладых мінчан загінулі ў начной аўтааварыі пад Лепелем.**

Трагедыя адбылася каля дзвюх гадзін ночы на 144-м кіламетры аўтадарогі Мінск — Віцебск паблізу вёскі Вярэбкі. Паводле інфармацыі УДАІ МУС, 22-гадовы вадзіцель «Аўдзі 100» выехаў на паласу сустрэчнага руху, дзе легкавік сутыкнуўся з грузавым аўтамабілем «Івека», якім кіраваў 50-гадовы жыхар Баранавічаў. У выніку дарожна-транспартнага здарэння кіроўца «Аўдзі» і два пасажыры 25 і 27 гадоў загінулі. Яшчэ адзін 28-гадовы пасажыр памёр у бальніцы.

### ПАЦЯРПЕЎ АПЕРАТАР «ТАЙФУНА»

**У Мінскім раёне аўтацягнік сутыкнуўся з аўтацыстэрнай «МАЗ».**

Такое дарожна-транспартнае здарэнне адбылося ўдзень на 16-м кіламетры трасы Мінск — Гродна каля вёскі Хацежына. Акалічнасці здарэння наступныя. Кіроўца аўтацягніка «Вольва» аб'язджаў аўтацыстэрну «МАЗ» і трактар «МТЗ» з установкай «Тайфун», якія былі задзейнічаны пры правядзенні ямачнага рамонту. Падчас манеўру і адбылося датычнае сутыкненне з аўтацыстэрнай «МАЗ». У выніку дарожна-транспартнага здарэння пацярпеў аператар устаноўкі «Тайфун», які займаўся рамонтам дарогі. Па інфармацыі Мінскага абласнога ўпраўлення МНС, пацярпелага з траўмамі рознай ступені цяжару даставілі ў гарадскую клінічную бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі. Аўтамабілі атрымалі механічныя пашкоджанні. Работнікі МНС правялі змыў з праезнай часткі дызельнага паліва і масла, якія праліліся з пашкоджанай аўтацыстэрны «МАЗ».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Аздараўленне

# СЕМ ЗАКОНАЎ САНАТОРЫЯ «СЛУЧ»

### Пабываўшы тут аднойчы, наведвальнікі абавязкова вяртаюцца зноў



**Дзіцячы санаторый «Случ», што ў Слуцкім раёне, чакае гасцей. Тут пройдзе рэспубліканскі семінар, які збярэ прадстаўнікоў зацікаўленых міністэрстваў і ведамстваў, уласнікаў і кіраўнікоў аналагічных устаноў, іх намеснікаў па медыцынскай рабоце і харчаванні, а таксама культурна-масавай рабоце. Прадстаўнічая аўдыторыя азнаёміцца з сучаснымі падыходамі ў арганізацыі санаторна-курортнага лячэння і аздараўлення дзяцей, якія пражываюць на забруджаных у выніку чарнобыльскай катастрофы тэрыторыях.**



Генеральны дырэктар ААТ «Белагразраўніца» Іван АВЕРЧАНКА.

### Для калег нічога не шкада

Чаму ж менавіта санаторыю «Случ» выпаў гонар прымаць гасцей? Вычарпальны адказ на гэтае пытанне даў **генеральны дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Белагразраўніца» Іван АВЕРЧАНКА.**

— Па выніках мінулага года санаторый заняў трэцяе месца ў Беларусі сярод дзіцячых санаторыяў. «Случ» — гэта ўстанова асаблівая, бо тут адпачываюць дзеці розных узростаў: малодшага, сярэдняга, а таксама падлеткі. Сёння 500 хлопчыкаў і дзяўчынак атрымліваюць тут паўнавартаснае лячэнне. Частку пуцёвак мы прадаём дзяржаве, а таксама знаходзім пакупнікоў у Расіі, Беларусі. З намі супрацоўнічаюць банкі, буйныя прадпрыемствы. Бадай, самае галоўнае, што хвалюе бацькоў, якія даручаюць нам сваіх выхаванцаў, — іх бяспечнае знаходжанне ў санаторыі. Мы распрацавалі методыку па гэтым пытанні, там сабраны ўсе неабходныя дакументы, і многія з нашых калег карыстаюцца гэтай нарматыўнай базай. Па-другое, Рэспубліканскі цэнтр па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва папрасіў нас паказаць іншым, як арганізаваны адпачынак і лячэнне дзяцей з чарнобыльскай зоны.

У «Случ» заўсёды ездзілі калегі яшчэ і для таго, каб пераняць вопыт выхавання, арганізацыі культурнай праграмы. Дзеці і падлеткі тут цалкам заняты карыснымі справамі, удзельнічаюць у разнастайных мерапрыемствах. А як вядома, той, хто заўсёды пры справе, не будзе займацца чымсьці непатрэбным. Акрамя таго, у санаторыі напрацаваны цесныя сувязі з навуковымі медыцынскімі цэнтрамі рэспублікі. Сюды прыязджаюць мэтры айчыннай медыцыны, прафесары, дацэнты, акадэмікі, якія бясплатна кансультуюць дзяцей. Вядома, што скарыстацца такой магчымасцю захоча кожная маці.

Дарэчы, менавіта «Белагразраўніца» першай у краіне пачала займацца продажам пуцёвак самастойна.

— Спачатку выйшлі на 10 працэнтаў, затым — на 25. А сёння і на ўсе 90, у тым ліку 40 працэнтаў ідзе на экспарт, — кажа Іван Фёдаравіч. — Да нас прыязджаюць грамадзяне Расіі, краін Балтыі, Польшчы, Францыі, ЗША, Ізраіля. Як правіла, усе яны выхадцы з былога Савецкага Саюза. Знаходзяцца ў санаторыях 30-35 дзён. За гэты час маюць магчымасць не толькі прайсці аздараўленне і лячэнне, але і наведаць сваю малую радзіму.



Людміла РУДАЯ са сваімі выхаванцамі.

Фотаздымкі Уладзіміра ХВОРАВА.

### ...І ніякіх чыпсаў

— Мы адзіныя ў Беларусі, хто ў аснову санаторна-курортнага лячэння і аздараўлення дзяцей паклаў прыродныя фактары, — уступае ў размову **намеснік генеральнага дырэктара Віктар ПАНАМАРОЎ**. — Для лячэння выкарыстоўваем мінеральную ваду, сапрапелевыя гразі, якія здабываем у Дзятлаўскім раёне. На базе санаторыя «Радон» наладзілі яе вытворчасць. Акрамя таго, стварылі надземную спелеалячэбніцу, дзе выкарыстоўваецца натуральная соль з Салігорска. Такога няма ні ў адным санаторыі Беларусі. Усяго ж у сістэме «Белагразраўніцы» 6 спелеалячэбніц, дзе лечаць захворванні дыхальных шляхоў. Але самае галоўнае — што знаходжанне тут служыць прафілактыцы захворванняў сардэчна-сасудзістай сістэмы.

Адпачываюць жа і праходзяць санаторнае аздараўленне ў «Случы» дзве групы дзяцей: так званыя сацыяльныя і з тэрыторый, якія кантралююцца. Для іх арганізавана збалансаванае харчаванне, а для дзяцей з забруджаных тэрыторый яно ўзмоцненае, змяшчае больш вітамінаў, бялкоў, вугляводаў.

— Як вядома, у свеце каля 40 працэнтаў дзяцей маюць атлусценне першай ступені з-за няправільнага харчавання дома. Існуе такая праблема і ў Беларусі, — канстатуе Віктар Аляксеевіч. — Мы цалкам выключылі з рацыёну сваіх падапечных каляровыя напоі, чыпсы, салодкае, акрамя мармеладу. Якасныя, экалагічна чыстыя прадукты набываем непасрэдна ў пастаўшчыкоў: чатыры гады таму правялі тэндар, вызначылі лепшых вытворцаў.

Падчас заезду дзецям прапаноўваюць адказаць на пытанне, якія прадукты ім падабаюцца. Яны, як правіла, адказваюць: каўбаса, сасіскі, сардэлькі, шашлыкі, чыпсы. А ў санаторыях за кароткі час іх трэба адвучыць ад ежы, якая прыносіць шкоду здароўю. Кантралююць працэс харчавання пяць чалавек: дзяжурная медсястра, выхавацель, загадчык сталовай, загадчык вытворчасці і начальнік медыцынскай часткі. Акрамя таго, дзяцей вучаць культуры паводзін за сталом, сервіроўцы.

### Бяспека ў рэжыме анлайн

У «Случы» шмат увагі надаюць бяспецы дзяцей. **Дырэктар санаторыя Міхаіл МАРАЧКОЎСКІ** дэманструе сістэму відэаназірання. На камп'ютары ў яго кабінеце добра відаць, што адбываецца не толькі ў памяшканнях, але і на двары.

— На набыццё і ўстаноўку сістэмы мы патрацілі 173 мільёны. Цалкам нясём адказнасць за жыццё і бяспеку сваіх падапечных. У рэжыме анлайн можам кантраляваць сітуацыю: адпачынак, лячэнне, харчаванне дзяцей.

Варта сказаць і пра тое, што санаторый «Случ» карыстаецца попытам не толькі ў беларусаў, але і замежнікаў. Шмат пуцёвак сюды набываюць грамадзяне Расіі. Напрыклад, група школьнікаў з Санкт-Пецярбурга разам з педагогам адпачывае ў пяты раз. Сёлета тут чакаюць наведвальнікаў па лініі Саюзнай дзяржавы — Беларусі і Расіі, паколькі санаторый выйграў адпаведны тэндар. Дарэчы, на конкурс Саюзнай дзяржавы ён заявіў больш высокую цану, чым канкурэнты, але камісія вызначыла менавіта «Случ». Як кажуць, выбралі якасць і прафесіяналізм. Пра гэта сведчаць як самі дзеці, так і педагогі, што іх суправаджаюць.

— Дзеці трапілі ў сапраўдную казку! — кажа Людміла Рудая з Рэчыцкага раёна. — Вакол прыгажосць, харчаванне выдатнае, мерапрыемствы цікавыя. Дзеці з вясковай школы змаглі пабачыць нават цыркавое прадстаўленне. І наогул, тут цудоўныя людзі, сапраўдныя прафесіяналы: пакаёўкі, медсёстры, педагогі. Мы напісалі падзяку, дзе гаворым работнікам санаторыя: не «да пабачэння», а «да хуткай сустрэчы!».

Аліну Музычэнка з сяброўкамі мы сустрэлі ў спелеалячэбніцы.

— Тут мы праводзім штодня паўгадзіны. Пасля курсу лячэння цэлы год не хварэем, — сцвярджаюць яны.

— Што яшчэ падабаецца? — цікаўлюся ў дзяўчат.

— Усё! — гучыць у адказ. — Але найбольш імпануе, што тут можна сябе праявіць творча, раскрыць свой талент, адчуць сябе дарослымі ў добрым сэнсе слова.

Камандзіры атрадаў на сваім савеце прынялі сем законаў санаторыя «Случ»: любоў, клопат, дабрыня і міласэрнасць; бяспека і здароўе; беражлівасць, эканомія і працалюбства; памяць і павага; актыўнасць; гонар і ўсмешка. Але бадай, самы галоўны — вяртанне ў дзіцячы санаторый «Случ».

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

# Гарачая пара... ПРЫЗЫЎНАЯ

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

*— Майму пляменніку 22 гады. Ён скончыў ВНУ і ўжо працуе па размеркаванні. Яму паставілі дыягназы — астэахандроз пазваночніка, кіфоз і грыжа Шморля. У сувязі з гэтым ён атрымаў адтэрміноўку на 3 гады. Ці лечацца гэтыя хваробы? І ці магчыма такое, што пасля заканчэння гэтага тэрміну юнака прызавуць у армію?*

**Таццяна СЕМАШКОВА,** *г. Мінск*

**Аляксандр ГАРБАРЧУК:** — Верагодна, ваш пляменнік прызнаны не прыдатным да вайсковай службы ў мірны час па стане здароўя і залічаны ў запас. У адпаведнасці з заканадаўствам, гэтая катэгорыя грамадзян знаходзіцца ў запасе, а па заканчэнні трохгадовага тэрміну выклікаецца ўрачэбнай камісіяй ваеннага камісарыята і падлягае пераагляду. Калі не будзе назірацца паляпшэння ў стане здароўя ці не зменяцца патрабаванні да медыцынскіх паказчыкаў, то юнак працягне знаходзіцца ў запасе да дасягнення 27-гадовага ўзросту.

*— Служу ў рэзерве. Ці можна спыніць тут службу і прызвацца на звычайную тэрміновую? Калі так, то я буду служыць там, дзе і служыў? А тэрмін залічыцца?*

**Дзмітрый,** *г. Барысаў*

**Андрэй МУРАШОЎ:** — Можна. Палажэнне праходжання службы ў рэзерве гэта прадугледжвае. Трэба звярнуцца з рапартам да камандавання вайсковай часці. І калі там прадугледжана праходжанне тэрміновай службы, то такі зварот будзе вырашаны на карысць ваеннаслужачага. Тэрмін ужо пройдзенай службы залічыцца з разліку 8 вучэбных гадзін у рэзерве за дзень тэрміновай службы.

*— Ці маюць права адправіць у войска мужчыну, жонка якога чакае дзіця?*

**Ірына ПАЛУБЕНКА,** *в. Данілевічы, Лельчыцкі раён*

**Андрэй МУРАШОЎ:** — У адпаведнасці з артыкулам № 32 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб вайсковым абавязку і вайсковай службе», такому грамадзяніну даецца адтэрміноўка па сямейным становішчы. Адтэрміноўка дзейнічае да нараджэння дзіцяці і да моманту дасягнення ім трохгадовага ўзросту. Затым грамадзянін паўторна выклікаецца на прызыўную камісію, якая разбіраецца, змянілася ў яго сямейнае становішча ці не. Калі ў маладога чалавека нарадзілася другое дзіця, то яму даюць адтэрміноўку да 27 гадоў, і ў далейшым ён ужо не прызываецца.

*— Да дасягнення 27 гадоў майму сыну засталося крыху больш як год. Ці маюць права яго прызваць у армію ўвосень?*

**Галіна,** *Ляхавіцкі раён*

**Андрэй МУРАШОЎ:** — Тут прынцып такі. Калі табе заўтра спаўняецца 27 гадоў, а цябе сёння адправілі служыць, ты служыш увесь тэрмін у залежнасці ад узроўню тваёй адукацыі.

*— Што тычыцца медыцынскіх паказчыкаў, то з цягам часу яны сталі больш ліберальнымі ці, наадварот, да стану здароўя пачалі падыходзіць больш жорстка?*

**Сцяпан КОЎКЕЛЬ,** *г. Петрыкаў*

**Аляксандр ГАРБАРЧУК:** — Патрабаванні да стану здароўя заўсёды ідуць у нагу з часам. У залежнасці ад развіцця медыцыны па пэўных паказчыках адбываюцца ўдакладненні. І нельга сказаць, што яны становяцца больш мяккімі ці жорсткімі. На сённяшні дзень сам пераклік захворванняў не змяніўся. Змяніліся толькі паказчыкі па графах прызначэння і катэгорыях годнасці. Калі параўноўваць патрабаванні да стану здароўя ў Расійскай Федэрацыі і ў нас, то яны амаль аднолькавыя.

*— Як трапіць служыць у міратворчую роту?*

**Аляксандр,** *в. Верцялішкі, Гродзенскі раён*

**Андрэй МУРАШОЎ:** — Як правіла, у міратворчай роце не служаць салдаты тэрміновай службы. У яе ўваходзяць тыя вайскоўцы, якія праходзяць вайсковую службу па кантракце. Аднак гэта не значыць, што ў добра падрыхтаванага салдата тэрміновай службы няма шанцаў туды трапіць. Паспрабуйце звярнуцца да камандавання гэтай роты (у 103-ю асобную мабільную брыгаду).

*— Ці можа студэнт ухіліцца ад праходжання вайсковай службы, калі прыйшла пара прызывацца?*

**Максім,** *г. Мінск*

**Андрэй МУРАШОЎ:** — Калі студэнт атрымлівае адукацыю на дзённым аддзяленні, то ён мае права на адтэрміноўку для працягу навучання. Гэта тычыцца студэнтаў сярэдне-спецыяльных навучальных устаноў і навучэнцаў першай ступені вышэйшай адукацыі. Калі юнак атрымлівае адукацыю на завочным аддзяленні, то яму неабходна прайсці мерапрыемствы прызыву. І ў залежнасці ад вынікаў далейшы яго лёс будзе вырашацца прызыўной і медыцынскай камісіямі. Хачу адзначыць, што ў выпадку прызыву такіх грамадзян на тэрміновую службу заканадаўствам зараз прадугледжаны акадэмічны адпачынак на перыяд, неабходны для праходжання тэрміновай ваеннай службы.

*— Па якіх абставінах прадугледжваецца адтэрміноўка ад прызыву? Ці ёсць тут пэўныя змены?*

**Галіна Іванаўна,** *г. Маладзечна*

**Андрэй МУРАШОЎ:** — Поўны пералік прадастаўлення адтэрміновак вызначаны артыкулам № 32 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб вайсковым абавязку і вайсковай службе». Там вычарпальны спіс даных і па сямейным становішчы, і па стане здароўя, і для працягу адукацыі... Апошнія змены былі ўнесены ў ліпені 2010 года. З таго моманту нічога не змянілася.

*— Мая сястра марыць аб ваеннай прафесіі. Ці магчымы для яе варыянт адслужыць у войску і застацца там па кантракце? У якіх відах войскаў могуць служыць дзяўчаты?*

**Вольга ПЯТРОВА,** *г. Мінск*

**Андрэй МУРАШОЎ:** — Для жанчын у нашай краіне не прадугледжваецца тэрміновая служба. Аднак яны маюць права паступіць на ваенную службу па кантракце. Для гэтага неабходна звярнуцца да камандавання любой вайсковай часці, дзе ёсць вакансіі ваеннаслужачых па кантракце на пасадзе салдат-сяржантаў. Звычайна жанчыны служаць у войсках сувязі і на медыцынскіх пасадах. Трэба адзначыць, што жанчыны-вайскоўцы па кантракце не вызваляюцца ад большасці тых абавязкаў, якія вызначаны для ваеннаслужачых. Яны разам з мужчынамі прымаюць удзел ва ўсіх службовых мерапрыемствах, якія праводзяцца ў часцях.

*— Калі майго сына прызывалі ў армію, медыцынскую камісію ён прайшоў на «выдатна». Пасля праходжання службы ён вырашыў уладкавацца на працу ў службу аховы. Яго туды не ўзялі: медыцынскія работнікі паставілі дыягназ — плоскаступнёвасць. Як магло такое атрымацца, што абараняць Радзіму ён быў здаровы, а абараняць асабістую ўласнасць — хворы?*

**Марына Аляксандраўна,** *г. Віцебск*

**Андрэй МУРАШОЎ:** — Тут справа ў прафесійным падыходзе. У кожнай сілавой структуры свае патрабаванні да той пасады, на якую разглядаецца кандыдат. Калі чалавек уладкоўваецца на працу ў органы МУС, ён праходзіць адну медыцынскую камісію. Нашы патрабаванні адпавядаюць праходжанню ваеннай службы. Калі малады чалавек для праходжання службы быў прыдатны, а вартаваць — не, то мэтазгодна задаваць пытанне ці прадстаўнікам гэтай службы, ці тым, хто прыдумляў такія патрабаванні. З іншага боку, гэты грамадзянін, які праходзіў службу ў арміі, мог служыць у войсках сувязі, дзе асаблівай нагрузкі на ногі ў яго не было. А трапіўшы ў тую ж службу аховы, яму трэба было б заўсёды хадзіць. І як гэтая нагрузка адбілася б на стане яго здароўя, невядома.

*— Верагодна, што ўвосень мой сын пойдзе ў армію. Справа ў тым, што да гэтага часу ён яшчэ не паспее выплаціць крэдыт, які ўзяў у банку раней. У такой сітуацыі аплата крэдыту перакладваецца на паручыцеляў?*

**Галіна Міхайлаўна,** *Брэсцкая вобласць*

**Андрэй МУРАШОЎ:** — Вы не першая звяртаецеся да нас з падобным пытаннем. Раней такой праблемы ў прызыўнікоў не было. Зараз — гэта актуальная тэма. З гэтай прычыны мы звярнуліся да шэрагу банкаў і заканадаўцаў з просьбай, і трэба сказаць, што многія пайшлі нам насустрач. Зараз з адыходам у армію прызыўніка яго аплата крэдыту на будаўніцтва і набыццё жылля прыпыняецца на тэрмін, які ён будзе праходзіць службу. Пасля звальнення са службы грамадзянін працягне ўносіць узносы роўна столькі, колькі яму засталося. Прычым без павелічэння працэнтаў.

*— Майму сыну 26 гадоў. Я пенсіянерка. Ён адзіны сын у сям'і, бацькі няма. Ён лічыцца карміцелем сям'і, таму ў армію не прызываецца. Неўзабаве ён збіраецца ажаніцца. Пытанне такое: ці захаваецца ў яго пасля жаніцьбы статус карміцеля, ці гэтыя абавязкі аўтаматычна перакладваюцца на жонку?*

**Марыя Паўлаўна,** *п. Нарач*

**Андрэй МУРАШОЎ:** — Яго жаніцьба і нават нараджэнне дзяцей ніякім чынам не паўплываюць на яго адтэрміноўку па доглядзе маці.

*— Наш сябар служыць у брыгадзе спецназа — часць нібыта сакрэтная. Ці можна туды трапіць да яго ў госці, каб паглядзець, як ён служыць? Можа, і нам туды захочацца. І наогул, ці могуць родныя паглядзець на свайго салдата падчас выканання ім сваіх службовых абавязкаў?*

**Павел,** *г. Слуцк*

**Андрэй МУРАШОЎ:** — Ва ўсіх вайсковых часцях праходзяць дні адчыненых дзвярэй і іншыя адкрытыя мерапрыемствы. Практычна заўсёды і ў ходзе ваеннай прысягі ва ўсіх вайсковых часцях даецца магчымасць пазнаёміцца з бытавымі ўмовамі вайскоўцаў. Вядома, калі праходзяць мерапрыемствы баявой падрыхтоўкі, у наведванні ёсць абмежаванні. У першую чаргу гэта звязана з арганізацыяй бяспекі. Увогуле, Узброеныя Сілы — гэта не музей. Галоўная мэта вайсковай службы — баявая падрыхтоўка.

*— У нас тэрытарыяльны прынцып камплектавання. Мы жывём у Гомелі. Тут шмат прызыўнікоў і вельмі мала вайсковых часцей. Куды адсюль можна трапіць служыць, блізка ж нічога няма?*

**Аляксандра Канстанцінаўна,** *г. Гомель*

**Андрэй МУРАШОЎ:** — Для вас тэрытарыяльным прынцыпам будзе тая вайсковая часць, якая бліжэй да Гомельскай вобласці. Далей Беларусі ніхто не паедзе. Таму казаць пра тэрытарыяльны прынцып для нашай краіны не зусім актуальна.

*— Што чакае тых юнакоў, якія ўхіляюцца ад вайсковай службы?*

**Віктар,** *Салігорскі раён*

**Андрэй МУРАШОЎ:** — У залежнасці ад складу правапарушэння іх чакае ці адміністрацыйная, ці крымінальная адказнасць. Калі гаворка ідзе пра адміністрацыйнае правапарушэнне, то гэта штраф да 5 базавых велічынь. Калі гэта крымінальная адказнасць, то, у залежнасці ад яе характару, юнака чакае альбо штраф, альбо выпраўленчыя работы, альбо пазбаўленне волі да 2-х гадоў.

*— Ці плануюцца якія-небудзь змены ў сістэме прызыву?*

**Рыгор ДАНІЛЬЧЫК,** *Пухавіцкі раён*

**Андрэй МУРАШОЎ:** — Так, сапраўды. Мы выйшлі з хадайніцтвам аб змяненні Закона «Аб вайсковым абавязку і вайсковай службе». І парламент пайшоў нам насустрач. У красавіку гэтага года ў першым чытанні прыняты законапраект, які прадугледжвае істотныя змены ў сістэме прызыву. Напрыклад, на ваенную службу па кантракце можна будзе прымаць у тым ліку і прызыўнікоў. Раней такога не дапускалася. Юнаку трэба было паўгода адслужыць тэрміновую службу, а потым заключаць з камандаваннем кантракт. Зараз мы даём такую магчымасць любому грамадзяніну адразу. Асабліва гэта будзе тычыцца прызыўнікоў з вышэйшай адукацыяй і якія маюць патрэбную для арміі спецыяльнасць. Верагодна, гэтае новаўвядзенне пачне практыкавацца ўжо ўвосень. Аднак яно не будзе вызваляць маладых людзей ад мерапрыемстваў прызыву. Яшчэ прадугледжваецца вызваленне ад вайсковай службы грамадзян, якія маюць трох і больш дзяцей, без усялякіх адтэрміновак.

**Падрыхтавала Вераніка КАНЮТА.**

**Сістэмы прызыву тэрміновай службы і службы ў рэзерве аднолькавыя. У тым ліку аднолькавыя і медыцынскія патрабаванні. Прызыўнікі праходзяць медыцынскі агляд, прызыўную камісію, якая вызначае, каго накіраваць на тэрміновую службу, а каго — у рэзерв.**

■ Праблема вады

# СЫРОЙ КАЛОДЗЕЖНАЙ НЕ ВЫП'ЕШ

**Міжнароднае грамадскае аб'яднанне «Экапартнёрства» пачынае інфармацыйную кампанію па праблемах якасці вады і здароўю. Паводле слоў яго выканаўчага дырэктара Аліны БУШМОВІЧ, мэта кампаніі — павысіць дасведчанасць шырокіх слаёў насельніцтва ў гэтым кірунку, і ў першую чаргу ў малых гарадах і сельскіх населеных пунктах. І хоць з 2003 года ў нашай краіне не было сапраўды вялікіх праблем, звязаных з якасцю вады, а менавіта ўспышак захваральнасці, наперадзе яшчэ шмат работы па паляпшэнні той сітуацыі, якая ёсць сёння.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Некалькі гадоў таму ў межах аднаго з праектаў «Экапартнёрства» высветлілася, што жыхары пасёлка Смілавічы Чэрвеньскага раёна ўжывалі калодзежную ваду з 5-разовым перавышэннем нітратаў. На ўзроўні населенага пункта пытанне з забеспячэннем насельніцтва якаснай вадой так пакуль і не вырашана. Па зразумелай прычыне — не хапае грошай. Аднак на персанальным узроўні кожны з нас можа і павінен ведаць, ваду якой якасці ўжывае. Для гэтага дастаткова звярнуцца ў мясцовы цэнтр гігіены. За ўмераны кошт там будуць праведзены адпаведныя даследаванні проб.

Што да калодзежаў, то неадпаведнасць такой вады санітарным патрабаванням звязана як з сельскагаспадарчай дзейнасцю, унясеннем арганічных і мінеральных угнаенняў, так і з парушэннем санітарна-гігіенічных патрабаванняў падчас размяшчэння, абсталявання і эксплуатацыі. Калодзежы трэба перыядычна чысціць, рамантаваць, нічога побач з імі не мыць і г.д. Большасць жа нашага насельніцтва карыстаецца, як вядома, вадой «з крана» — артэзіянскай. Гэта выдатна, але цалкам праблем не выключае.

— Леташняе даследаванне камунальных водаправодаў, якія эксплуатуюцца жыллёва-камунальнай службай і водаканаламі, паказала ўсяго 0,5 працэнта нестандартнай вады па бактэрыялагічных паказчыках, — кажа загадчыца аддзела камунальнай гігіены Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ірына ЖАЎНЯК. — У калодзежах гэты паказчык — 10 працэнтаў, у ведамасных водаправодах, якія знаходзяцца на абслугоўванні прадпрыемстваў, — 1 працэнт. Бяспечнай жа, згодна з міжнароднымі нормамі, лічыцца вада з «нестандартам» у 5 працэнтаў. Такім чынам, відавочна, што з калодзежаў сырую ваду лепш не піць. 43 працэнты свідравін падаюць ваду з павышанай колькасцю жалеза. Праўда, дзякуючы станцыям абезжалезвання колькасць проб з жалезістымі злучэннямі зніжаецца. Наогул жалеза у тых канцэнтрацыях, у якіх ёсць у нас, не валодае таксічным уздзеяннем. Тым не менш ёсць пэўныя нязручнасці пры ўжыванні такой вады як для піцця, так і для бытавых патрэб. Санітарна-хімічнае даследаванне вады з калодзежаў паказала 25 працэнтаў нестандартных спроб — у асноўным за кошт павышанай колькасці тых жа нітратаў. Эфектыўнага агульнадаступнага метаду ачысткі вады ад нітратаў, на жаль, не існуе. Выйсце толькі ў будаўніцтве цэнтралізаванага водаправода...

У сельскіх населеных пунктах за апошнія дзесяць гадоў пабудавана каля 200 станцый абезжалезвання. Гарады і гарадскія населеныя пункты забяспечаны цэнтральным водазабеспячэннем на 97 працэнтаў, аграгарадкі — на 80. Да 2016 года гэта павінны быць адпаведна 98 і 84 працэнты.

Паводле слоў загадчыка кафедры «Водазабеспячэнне і водаадвядзенне» Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта Уладзіміра АНУФРЫЕВА, дзяржпраграма «Чыстая вада» на 2011—2015 гады ўказвае на такія нявырашаныя праблемы:

✓недастатковы ўзровень забяспечанасці насельніцтва цэнтралізаваным водазабеспячэннем (не забяспечана 1,4 млн чалавек);

✓недастатковы ўзровень забяспечанасці насельніцтва пітной вадой нарматыўнай якасці з сістэм цэнтральнага водазабеспячэння (каля 2 млн чалавек выкарыстоўваюць ваду з узроўнем жалеза, вышэйшым за санітарную норму — 0,3 мг/л );

✓неадпаведнасць санітарным патрабаванням вады з крыніц цэнтралізаванага водазабеспячэння. Каля 40 працэнтаў даследаваных проб не адпавядалі патрабаванням па санітарна-хімічных і каля 16 працэнтаў — па мікрабіялагічных паказчыках. У асноўным не адпавядала стандартам колькасць нітратаў, агульная колькасць салей, арганалептычныя якасці, колькасць жалеза і аміяку;

✓высокая фізічная зношанасць аб'ектаў ачысткі, адсутнасць сучасных тэхналогій і абсталявання для ачысткі сцёкавых водаў, у тым ліку ад азоту і фосфару.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

## БЕЗ ДЭКЛАРАВАННЯ ДАРАЖЭЙ АБЫХОДЗІЦЦА

**Буйная партыя жаночага адзення — 2840 адзінак — была канфіскавана супрацоўнікамі аператыўнага аддзела гомельскай мытні каля Добруша.**

Як расказаў начальнік аддзела мытных расследаванняў Алег Швед, вопратка была перамешчана без дэклараванняз тэрыторыі Украіны спачатку ў Расію, а потым — у Беларусі. Канфіскаваны тавар ацэньваецца ў суму Br880 млн рублёў. Ля вёскі Селішча ў тым жа Добрушскім раёне быў прыпынены аўтамабіль, якім кіраваў грамадзянін Расіі. Высветлілася, што ў яго машыне без дакументаў перавозілася вялізная партыя анабалічных сродкаў. Камерцыйная партыя ў колькасці звыш 4,6 тысячы адзінак на суму больш Br1 млрд канфіскавана.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

■ Вернісажы

# ГЛЯДЗІЦЕ, ХТО ПРЫЕХАЎ!..

## Нікас Сафронаў мае лепшую ў Маскве кватэру, не лаецца матам, а нявесту шукае ў Беларусі

**У Брэсце адкрылася выстава самага свецкага расійскага мастака Нікаса Сафронава. Яго яшчэ называюць самым пазнавальным расійскім майстрам за мяжой — ён пісаў партрэты Сафі Ларэн, Элізабэт Тэйлар, Алена Дэлона, Жана-Поля Бельмандо, Вудзі Алена, Леанарда ды Капрыа, Хуліа Іглесіаса, Элтана Джона ды іншых славутасцяў. Яшчэ яго называюць шоуменам. Сафронаў — часты госць гламурных тусовак, пастаянны герой свецкай хронікі і розных піяр-перадач.**



Фота БЕЛТА.

Праславіўся мастак найперш партрэтамі, выкананымі па замове «зорак» шоу-бізнесу ды вядомых палітыкаў. Яму пазіравалі Буш-старэйшы і Буш-малодшы, Уладзімір Пуцін і Дзмітрый Мядзведзеў, Віктар Януковіч і іншыя кіраўнікі дзяржаў.

У Брэст 57-гадовы майстар прывёз больш за 70 работ, сярод якіх партрэты Маі Плісецкай, Кірыла Лаўрова, а таксама Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі.

Мастака сустрэлі напярэдадні на чыгуначным вакзале. Нікас папрасіў прабачэння за свае павольныя рухі, бо носіць пасляаперацыйны бандаж, але гэта не ўтрымала яго ад танцу з дзяўчатамі ў нацыянальных касцюмах, якія паднеслі госцю хлеб-соль. Пасля Нікас накіраваўся ў Генконсульства Расіі, дзе адказаў на шматлікія пытанні журналістаў.

Мастаку вельмі спадабалася, што цягнік з Масквы прайшоў без праблем, яго не спынілі на мяжы нашых дзяржаў. Ва Украіне ён сутыкнуўся з іншымі правіламі ўезду.

Пра сваю работу сказаў наступнае:

— Пішу я так: пачынаю як рамеснік, заканчваю як мастак. Натхненне прыходзіць падчас працы. Работы — як дзеці, а я як строгі бацька часта бываю імі незадаволены.

У Расіі з мастацтвам становіцца горш, лічыць майстар.

— Добрыя мастакі засталіся ў правінцыі. Тыя, хто працягвае савецкія традыцыі і вучыўся ў выкладчыкаў класічнай школы. Сёння выкладаюць людзі, якія дрэнна ставяцца да жывапісу. Таму ў пашане часта бывае не тэхніка малюнка, а якая-небудзь акцыя, далёкая ад мастацтва наогул. Што зробіш? Публіку цікавіць, з кім жыве Сабчак, ад каго цяжарная Алсу... Гей-парад — гэта нармальна. На Захадзе за крытыку геяў могуць наогул пасадзіць. У свеце ўсё мяняецца. Людзі забываюцца пра галоўнае, на чым усё і трымаецца: любоў, сям'я...

Мэтр сказаў, што не лічыць сябе стыльным чалавекам, бо стыль — гэта ўнутраны змест і вынік выхавання цягам усяго жыцця. А не так даўно ён пачуў, што калі чалавек выкарыстоўвае мат, анёл-ахоўнік пакідае яго на тры дні. З той пары ён перастаў лаяцца.

Сафронаў — не бедны чалавек. Паводле яго слоў, ён мае дом ў Палтаве, сядзібу XVI стагоддзя ў Шатландыі. А яго раскошная кватэра ў Маскве ў стылі готыкі і эклектыкі прызнаная лепшай у свеце ў сваім сегменце. А вось гаспадыні ў ёй няма. Ці то жартам, ці ўсур'ёз Нікас сказаў: «Сваю Галу я прыехаў шукаць у Беларусь. Мая дзяўчына мяне кінула».

Выставу, якая адкрылася ў мастацкім музеі Брэсцкай крэпасці, і яе аўтара прывіталі Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расіі ў Беларусі Аляксандр Сурыкаў і старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін Сумар. Па праваслаўнай традыцыі, вернісаж асвяцілі. «Спадзяюся, гэта прыдасць карцінам духоўнай сілы», — адзначыў Нікас Сафронаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■ Жывая зямля

# НЕРАСКІДАНЫЯ ГНЁЗДЫ

**Вёска Харужанцы. На ўзвышшы, нібы прыласканы белагрудымі бярозамі, грэецца на паўдзённым сонейку фасад будынка літаратурнага музея Янкі Купалы. За будынкам — цяністы гаёк з ясеняў, клёнаў, вольхаў і старых яблынь. У чэрвеньскія дні тут — сапраўдны птушыны інтэрнат. Якіх толькі шчабятушак у дні росквіту прыроды тут не пабачыш!**



Шпакі, шэрыя дразды, сярэднія дзятлы, берасцянкі, пячураўкі, белыя пліскі. Побач на палянцы ў высокай траве схавалі сваю ўтульную «хатку» жаваранкі. Дзесьці зусім побач дзярэ горла драч. Бліжэй да лазняку не спыняе салодкую песню салавей. Здзіўляе, што птушкам зусім не цесна, кожнай хапае месца, усе яны мірна ўжываюцца, не парушаючы правоў суседніх крылатых насельнікаў. У кожнай птушынай пары свая «кватэра» і свае бацькоўскія абавязкі — выгадаваць птушанят. Таму да рознагалосся дарослых цяпер дружна далучаюцца танюткія піскі малечы. Гэты гоман пачынаецца з першых промняў сонца і сціхае толькі ў хвіліны змяркання. Дзяцел-працаўнік за зіму і вясну паспеў стварыць некалькі кватэр-дуплаў, якія прыйшліся даспадобы і «недуплістым» відам. Малое, яшчэ не аперанае птаства «бессаромна» просіць есці, і птушкі-бацькі вымушаны мітусіцца між галін у пошуках здабычы-ежы.

Цікава паназіраць за сямейкай сярэдняга дзятла. Сваё дупло гэтыя стракатыя істоты зрабілі на вышыні двух метраў, і здымаць іх прылёты і адлёты надзвычай проста: дастаткова прытаіцца ў «засадзе» пад абвіслымі галінамі клёна за 5-7 метраў. Не праходзіць і дзесяці хвілін, як адна з дарослых птушак з'яўляецца каля адтуліны. Час ад часу заклапочаныя птушкі ў чырвоных каптурыках прылятаюць адначасова, і тады заскокваюць у круглую адтуліну па чарзе. Назад выныраюць са смеццем у дзюбах — кавалачкамі драўніны і памётам птушанят. Праз тыдзень яны будуць карміць сваіх гадаванцаў звонку, бо ў дупле будзе цесна.

Блукаючы па колішніх купалавых сцежках і назіраючы за гэтым птушыным суіснаваннем, міжволі ўзгадалася назва паэмы-драмы, якую паэт завяршыў роўна сто гадоў таму. Над «Раскіданым гняздом» Янка Купала працаваў у суседніх з Харужанцамі Акопах. І там пад цяністымі шатамі і ў высокіх травах не сціхае радасны птушыны гоман. Стаіўшыся, можна ўбачыць шмат цікавага з жыцця птаства, адчуць сапраўдную гармонію прыроды, у якой няма месца драмам з раскіданымі гнёздамі.

**Анатоль КЛЯШЧУК,
фота аўтара.**

***Лагойскі раён.***









# «АТРЫМАЎШЫ ДЗВЕ «ПЯЦЁРКІ», ДУМАЕМ ПРА БУДУЧЫНЮ»



## Наваполацку — 55.

**Гэтую прыемную дату навапалачане будуць святкаваць 8 чэрвеня, у Дзень горада. Напярэдадні карэспандэнты «Звязды» сустрэліся са старшынёй Наваполацкага гарвыканкама Наталляй КАЧАНАВАЙ.**

### Прадстаўляем суразмоўцу

**Працоўную загартоўку Наталля Іванаўна атрымала ў калектыве Полацкага водаканала. Пасля заканчэння Наваполацкага політэхнічнага інстытута працавала тут у вытворча-тэхнічным аддзеле, узначальвала прафсаюзны камітэт.**

**Далей у працоўнай біяграфіі былі Полацкая ЖКГ, адпаведная служба гарвыканкама. З пасады кіраўніка профільнага аддзела атрымала прызначэнне на пасаду намесніка старшыні гарвыканкама. Праз шэсць гадоў абрана старшынёй Наваполацкага гарвыканкама.**

**Член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.**

**Напярэдадні 55-годдзя горада Прэзідэнт узнагародзіў групу навапалачан медалём «За працоўныя заслугі». У іх ліку і Наталля Іванаўна. Віншуем!**

— За 55 гадоў на левым беразе Заходняй Дзвіны вырас горад-прыгажун. Спачатку ён развіваўся як горад нафтаперапрацоўшчыкаў, а зараз у ім прадстаўлены і іншыя галіны эканомікі, — расказвае Наталля Іванаўна. — Вельмі ўдалым для гарадской гаспадаркі стаў мінулы, 2012 год. Мы змаглі нармальна сфарміраваць гарадскі бюджэт, выканалі тыя задачы, якія не маглі выканаць у мінулыя гады. Скажам, завяршылі рэканструкцыю памяшкання пад цэнтр дзённага знаходжання інвалідаў — ён адкрыўся ў будынку тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнай абароны, таксама новага. Адкрылі пасля рамонту радзільны дом, сёння ён прымае жанчын двух гарадоў — Наваполацка і Полацка — і дзесяці раёнаў. Практычна да завяршэння падыходзіць рэканструкцыя галоўнага корпуса бальніцы: яна не рамантавалася шмат гадоў, і ў дні святкавання 55-годдзя Наваполацка плануем адкрыць галоўны корпус. Выканалі рэканструкцыю басейна ў 4-й школе і завяршылі рэканструкцыю гарадской лазні. Адрамантавалі і адкрылі 26-ы магазін.

Быў выкананы вялікі аб'ём работ па асфальтаванні дарожнага пакрыцця гарадскіх тэрыторый, у першую чаргу вуліц. А гэта больш за 200 тысяч квадратных метраў. Нават болей, чым перад святкаваннем 50-годдзя. Увялі ў эксплуатацыю лыжаролерную трасу.

І вялікі аб'ём работ выканалі па капітальным рамонце жыллёвага фонду. Адным словам, накіравалі сродкі, якія змаглі закумуляваць у бюджэце — каля 130 мільярдаў рублёў дадаткова — на капітальныя расходы, у такім аб'ёме, што сёння спакойныя за работу сваёй гарадской гаспадаркі. Гэта адразу адбілася на ўзроўні і якасці паслуг, што аказваюцца насельніцтву, у выніку на парадак зменшылася колькасць зваротаў жыхароў па гэтай праблематыцы.

Год быў цікавы яшчэ і тым, што стаў своеасаблівым экзаменам для самой нашай жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Мы перавялі ўсе яе прадпрыемствы на самастойны баланс, і цяпер яны працуюць цалкам самастойна. Па шляху рэструктурызацыі мы пайшлі, каб працоўныя калектывы маглі зарабляць сабе сродкі, павышаць зарплату людзям і цалкам адказваць за пэўны від паслуг. У новых умовах гэтыя прадпрыемствы працуюць дастаткова зладжана. Там нармальная працоўная атмасфера, належная зарплата, добрыя ўмовы працы.

Я звярнула ўвагу, што і на прыёмы ў выканкам сталі менш прыходзіць людзі па пытаннях, якія тычацца ЖКГ. Захацелася пабываць у домакіраўніцтвах, таму што туды людзі хутчэй звернуцца са сваімі праблемамі. І ведаеце, прайшла чатыры ЖЭСы, а пытанняў, што тычацца работы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, зусім мала. У некаторых яны наогул знятыя. Напрыклад, учора была ў домакіраўніцтве, створаным шляхам аб'яднання двух невялікіх. Праблемных пытанняў няшмат. А гэта паказчык уладкаванасці побыту людзей, калі іх нішто не раздражняе.

Такім чынам, 2012 год стаў часам сапраўднай падрыхтоўкі да знамянальнай даты ў жыцці горада.

Але ўсё ж самае галоўнае дасягненне — гэта тое, што ўпершыню за 16 гадоў мы пераламілі сітуацыю ў дэмаграфіі, і нараджальнасць перавысіла смяротнасць. Тэндэнцыю захавалі і сёлета. Няхай сабе станоўчая дынаміка невялікая, за чатыры месяцы — плюс 25, але гэта таксама цудоўна. Нам патрэбен прырост насельніцтва. У горадзе фактычна няма беспрацоўя, на ўліку ў цэнтрах занятасці стаіць 460 чалавек, а вакансій — каля 800. Так што нам патрэбны людзі. Патрэбны спецыялісты будаўнічай галіны, патрэбны ўрачы, мы прадастаўляем ім службовае жыллё. Патрэбен сярэдні медыцынскі персанал. Патрэбны прадаўцы, повары.

У нас станоўчы міграцыйны працэс — летась горад прырос на тысячу чалавек. Было 106 тысяч жыхароў, стала 107. Мы лічым, чым хутчэй будзе прырастаць горад па колькасці жыхароў, тым лепш для яго. У нас ёсць работа, ёсць месцы ў дзіцячых садках і школах. У новым мікрараёне будуем комплекс «яслі — дзіцячы садок — школа». Так што запрашаем у Наваполацк, будзем рады папаўненню.

**— Пра што сёння ішла размова на штотыднёвай планёрцы ў старшыні гарвыканкама?**

— Гаварылі, што прыйшоў час шукаць магчымасці, каб павышаць заработную плату ў сацыяльнай сферы. Такія катэгорыі, як урачы, настаўнікі самі павінны быць сацыяльна абароненымі. Тым больш калі ў таго ці іншага калектыву ёсць магчымасці зарабляць так званыя небюджэтныя сродкі, аказваць платныя паслугі, то такой магчымасцю варта карыстацца. У гэтым сэнсе можна прывесці прыклад нашага вучылішча алімпійскага рэзерву, якое па-гаспадарску выкарыстоўвае сваю матэрыяльную базу і летась зарабіла больш за 1,5 мільярда. Сюды прыязджаюць расіяне, праводзяць трэніровачныя зборы і за гэта плацяць. Тут праходзяць разнастайныя спаборніцтвы, у тым ліку рэспубліканскія. На лета ў іх ужо ўсё расписана, матэрыяльная база і кадры не прастойваюць.

На планёрцы не магла не ісці гаворка пра мадэрнізацыю прадпрыемстваў: на яе нацэлены ўсе прадпрыемствы горада. Па гэтай праграме працуем дастаткова доўга, і шэраг калектываў ужо правялі пераасначшэнне вытворчых магутнасцяў. Доўгі час праблемным заставаўся завод БВК. Сёння туды прыйшлі інвестары і ўсур'ёз займаюцца праектаваннем, працуюць на перспектыву, пачалі рэструктурызацыю, і мы разлічваем, што ў выніку атрымаем сучасную вытворчасць.

У цэлым сітуацыя ў эканоміцы горада нармальная, тон задае «Нафтан», мы ганарымся яго размашыстым крокам. Свой уклад уносяць і іншыя калектывы. Шырока вядомая сваімі трыкатажнымі вырабамі, напрыклад, наша «Любава». Зараз тут ствараюць сумеснае прадпрыемства з польскімі калегамі.

Важна, што развіваецца прыватны бізнес. У горадзе 4 тысячы суб'ектаў гаспадарання, і пераважаюць прадпрыемствы і арганізацыі прыватнай формы ўласнасці. Мы да ўсіх ставімся аднолькава, не дзелім па формах уласнасці. Радуемся поспехам «Белсплата»: на суперсучасным абсталяванні, аналагаў якому няма ў Беларусі, прадпрыемства выпускае прыгожыя дзверы надзвычай высокай якасці з запорнымі прыстасаваннямі і ўжо мае 18 філіялаў па ўсёй краіне. Не менш вядомае прадпрыемства «Юджын», якое выраблае трансфарматары і працуе практычна толькі на экспарт. «Прайд» займаецца вытворчасцю вырабаў для завода «Атлант». «Інтэрфорэст» выпускае вырабы з драўніны і таксама працуе практычна толькі на экспарт. Адно з лепшых у краіне прадпрыемстваў «Белтэхнасэрвіс» паспяхова займаецца грузавымі перавозкамі. Пералік можна працягваць.

Толькі ў прыгарадным пасёлку Баравуха, на тэрыторыі якой дзейнічаюць пэўныя прэферэнцыі па падаткаабкладанні, працуюць больш за 70 прадпрыемстваў.

Нармальныя і фінансавыя паказчыкі работы горада. Маем станоўчае сальда па экспарце. У нас ёсць чысты прыбытак. Высокая выручка на аднаго працоўнага — за студзень—сакавік яна склала 57,4 тысячы долараў, па студзені—красавіку плануем 74,8, па студзені—маі 94,6. А па выніках года выканаем нават 262. Заработная плата ў красавіку склала 6 мільёнаў 531 тысячу. Спадзяемся, што за май яна будзе значна большай.

Будуем жыллё. На гэты год даведзена заданне 47 тысяч квадратных метраў. Правялі мадэрнізацыю завода КПД і дамы ўзводзім з панеляў новай серыі — павышанай цеплаправоднасці, па сучасных праектах.

Да Дня горада плануем адкрыць яшчэ адзін гандлёвы аб'ект у новым, 8-м мікраараёне (яго будуе прыватнае прадпрыемства). А да канца года запланаваны ўвод у строй буйнога гандлёвага аб'екта на 13,5 тысячы квадратных метраў (таксама ўзводзіць прыватнае прадпрыемства). Апошнім часам прададзена пяць зямельных участкаў пад будаўніцтва гандлёвых і гандлёва-забаўляльных цэнтраў.

**— Для многіх прыватных прадпрыемстваў Баравуха стала апорнай базай, таму што там ёсць свабодныя вытворчыя плошчы і зямля?**

— У самім горадзе з зямлёй ужо складана, збіраемся з цягам часу абжываць другі бераг ракі Заходняя Дзвіна. Зараз у стадыі зацвярджэння генеральны план развіцця Наваполацка да 2030 года, і згодна з ім уся перспектыўная забудова ў далейшым будзе весціся на правабярэжжы. І першачарговай задачай становіцца клопат пра інжынерна-транспартныя камунікацыі, у тым ліку пра забеспячэнне новых мікраараёнаў цяплом. Наша ЦЭЦ размешчана на левым, заселеным беразе, і ўжо зараз займаемся пытаннем будаўніцтва дзюкераў. І цэлым комплексам іншых, не менш жыццёва важных пытанняў.

Горад расце, таму трэба клапаціцца пра тое, каб у ім было зручна жыць. Завяршаецца праектаванне маставога пераходу, які дазволіць палепшыць транспартны рух і экалагічную сітуацыю ў горадзе. Зараз увесь транспарт у прамысловую зону ідзе праз цэнтр горада. Будаўніцтва гэтага моста дазволіць транспартнаму патоку пайсці па аб'язной і выйсці на трасы, якія звязваюць нас з іншымі рэгіёнамі.

Што яшчэ? Спраўляемся з прагнознымі паказчыкамі. Па выніках рэйтынгавай ацэнкі дзейнасці выканкамаў па выкананні даведзеных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця выйшлі на першае месца ў вобласці. Ёсць пэўная задаволенасць — многае зроблена. Але трэба зрабіць яшчэ таксама шмат. Разлічваем на канструктыўную падтрымку старшыні Віцебскага аблвыканкама Аляксандра Мікалаевіча Косінца — мы такую падтрымку мелі заўсёды.

**— Традыцыйнае пытанне для нашых з вамі сустрэч: як выконваецца задача па кіраўніцтве рэальным сектарам, па ўплыве гарадской улады на эканоміку?**

— У нас выканаўчая ўлада не абстрагавана ад жыцця, у тым ліку і ад эканамічнага. Мы вельмі актыўна працуем з прадпрыемствамі. Пасля таго, як былі зацверджаны ўсе праграмы па мадэрнізацыі і тэхнічным пераасначшэнні прадпрыемстваў, выканкам узяў іх на кантроль. Я і мае намеснікі выязджаем на месцы, сустракаемся з кіраўнікамі, галоўнымі спецыялістамі. Асноўную ўвагу звяртаем на перспектывы развіцця калектыву — чым ён будзе займацца далей.

Мы не проста госці на прадпрыемствах. Прыязджаем, знаёмімся з сітуацыяй, унікаем, дапамагаем, дзе трэба, падстаўляем плячо. Тое, што можам вырашыць на сваім узроўні, вырашаем самі. Не — выходзім на міністэрства, ведамства, бо шэраг нашых прадпрыемстваў адносяцца да рэспубліканскай формы ўласнасці. Кіраўнікоў праблемных прадпрыемстваў запрашаем на пасяджэнне выканкама і разам шукаем выйсце з сітуацыі. На прадпрыемствах праходзяць і выязныя пасяджэнні выканкама, сітуацыя там разглядаецца метадам «мазгавога штурму». На днях такое пасяджэнне правялі на хлебазаводзе. Гэта ў цэлым нядрэнны калектыў, але даведзенае заданне па індэксе фізічнага аб'ёму выконваецца на 104-105 працэнтаў, у той час як ёсць усе перадумовы, каб паказчык быў значна вышэйшым.

У горадзе актыўна працуе Савет дырэктараў. Пытанне павышэння зарплаты на штотыднёвай планёрцы разглядалася з яго ўдзелам. Запрошаны былі 30 кіраўнікоў калектываў, якім трэба больш актыўна працаваць у гэтым напрамку.

Не баімся ісці на рэструктурызацыю, як гэта было з гандлёвым прадпрыемствам «Базіс», калі яму перадалі сістэму грамадскага харчавання горада і такім чынам выратавалі ўсю сетку рэстаранаў, сталовых і кавярняў ад закрыцця. Ніхто не застаўся без работы, а «Базіс» атрымаў штуршок у сваім развіцці.

Калі бываем у калектывах, то звяртаем увагу на ўмовы працы, на тое, як арганізавана харчаванне. Асобна пытанне аб харчаванні ў рабочых сталовых разгледзелі на пасяджэнні выканкама. Адно з апошніх па часе пасяджэнняў правялі ў аўтапарку № 6, які з'яўляецца адным з лепшых у краіне. Там такія ўмовы працы для калектыву, што іншым дырэктарам варта было гэта пабачыць.

**— Якое месца ў рабоце выканкама займае клопат пра духоўнасць гараджан, Наталля Іванаўна? Ордэн Еўфрасінні Полацкай, з якім мы вас сардэчна віншуем, асабіста вам быў уручаны за плённую работу па духоўным адраджэнні...**

— Я лічу, што ў кожным чалавеку ёсць свой патэнцыял духоўнасці, ён закладзены бацькам і маці, вякамі эвалюцыі жывой істоты як Чалавека. Іншая справа, што ўплываюць спрыяльныя ці, наадварот, неспрыяльныя ўмовы, якія, магчыма, не даюць некаму раскрыцца ў поўнай меры.

Я нядаўна вярнулася з Украіны. Там вельмі добразычліва гавораць пра нашу краіну, пра наш народ. Лепшыя якасці беларусаў вядомыя ў свеце. Так, у нашага народа дастаткова і дабрыні, і памяркоўнасці, і высокай духоўнасці таксама. І не трэба ўсё гэта ў сабе хаваць, саромецца тварыць дабро, дапамагаць слабаму і хвораму, быць міласэрным. Варта выводзіць дабрыню, маральнасць на іншы, паўсядзённы ўзровень. Тут шмат работы ўсім нам, у тым ліку дзяржаўным структурам, грамадскім арганізацыям і прэсе, тэлебачанню. Мне нядаўна разанула слых фраза музыкальнага крытыка ў праграме «Набытак рэспублікі», які выказаў думку, што наўрад ці песня на словы Андрэя Дзяменцьева пра пісьмо з фронту пераможа ў конкурсе толькі таму, што моладзь сёння не ведае, што такое салдацкі трохкутнік... Дык растлумачце таму, хто не ведае! І зрабіце гэта так, каб юная душа адгукнулася і ёй стала дарагім усё тое, што было дарагім для бацькоў і дзядоў.

Мы ў сваёй працы надаём велізарнае значэнне рабоце грамадскіх фарміраванняў і падбору тых, хто стаіць на чале іх. Нядаўняе мерапрыемства нашай арганізацыі «Белая Русь» пад назвай «Пераможныя маршы», у якім школьнікі маршыравалі перад ветэранамі — якраз з ліку тых, што бяруць за жывое. Паўтаруся: патэнцыял духоўнасці ў нашага народа вялікі, проста трэба спыніцца ў паўсядзённых клопатах, азірнуцца, успомніць пра свае вытокі.

У нас склаліся цудоўныя адносіны з Полацкай епархіяй, Уладыка Феадосій — ганаровы грамадзянін горада Наваполацка. Традыцыйнымі сталі «Велікодныя сустрэчы» ў гарадскім Доме культуры ці Палацы «Нафтана». Мы ўсім мірам узводзілі храм, зараз ён прыняў прыхаджан, ідуць службы. Але спатрэбілася яшчэ нешта дарабіць. Вырашылі — не будзем аб'яўляць суботнік, проста вядзецца добраахвотны збор сродкаў на гэтыя мэты. Што яшчэ раз пераконвае: людзям патрэбна вера.

Нядаўна правялі другі гарадскі сход (першы прайшоў два гады таму) на тэму «Неабыякавасць — шлях да надзейнага грамадства». На ім вельмі коратка, з лічбамі і фактамі на руках, выступілі тыя, хто ў сілу прафесіі займаецца прафілактыкай п'янства і алкагалізму. Гэтай праблемай займаецца і спецыяльна створаная каардынацыйная рада.

Па вопыце прыёму наведнікаў ведаю, што многім патрэбна падтрымка — нават не матэрыяльная, хутчэй — маральная. І на апаратных нарадах заўсёды кажу работнікам выканкама: давайце працаваць так, каб у горадзе ведалі, што заўсёды ёсць куды прыйсці, куды патэлефанаваць, і табе дапамогуць. У нас выканаўчая ўлада не закрыта ні для каго.

Сёння ў горадзе цудоўна працуе жаночая арганізацыя. Ствараюцца новыя пярвічкі. І ніхто нікога не прымушае, бо колькасныя паказчыкі нам не патрэбны. Проста жанчынам у іх цікава, яны бачаць, што ёсць рэальная дапамога ад гэтай структуры.

Адзін са складнікаў такой работы — прытрымліванне духоўных традыцый зямлі Полацкай. Традыцый многа, і ў сваім паўсядзённым жыцці, у рабоце мы кіруемся імі, і гэта перарастае ў асобную тэму. Давайце дамовімся, што на яе мы падрабязна пагаворым у наступны раз.

**— Дзякуй за гутарку, шаноўная Наталля Іванаўна. Прыміце віншаванні ад «Звязды» з 55-годдзем Наваполацка і Днём горада і самыя шчырыя пажаданні навапалачанам і вам асабіста.**






# ПРЫВАБНЫ ТВАР ГОРАДА

**Наваполацк — горад, які здзіўляе чысцінёй. Давайце пацікавімся, дзякуючы каму. Гутарым з дырэктарам дзяржаўнага прадпрыемства «Наваполацкая спецаўтабаза» Юрыем ШЫПКІНЫМ.**



Дырэктар спецаўтабазы Юрый ШЫПКІН (першы справа), вадзіцель Ігар КАЗЛОЎСКІ, галоўны механік Сяргей КАСЦЯНКОЎ.

— Згодна са статутнымі дакументамі, мы займаемся бягучым утрыманнем аб'ектаў добраўпарадкавання горада. Выконваем санітарнае прыбіранне, азеляненне, ямачны рамонт, вонкавае асвятленне і гэтак далей.

Як вы зразумелі, галоўная задача, якую вырашае калектыў, — падтрыманне чысціні. Таму як мае быць клапоцімся пра прыбіранне — механізаванае і ручное. Пра належнае ўтрыманне праезнай часткі вуліц і дарог, тратуараў, пра захаванне парадку на прыпыначных пляцоўках грамадскага транспарту.

Ёсць участак добраўпарадкавання, у яго складзе — уласны асфальтавы завод, брыгада па рамонце дарожнага пакрыцця і ўкладцы асфальту. Галоўныя дзеючыя асобы ўчастка санпрыбірання — нашы ўборшчыкі тэрыторыі. І... тэхніка. Зімой са снегам гераічна змагаўся менавіта гэты ўчастак.

Што датычыць азелянення горада, то ўсе кветкі на яго вуліцах — наш «прадукт». Самі вырошчваем і расаду. Спілоўваем старыя, аварыйныя дрэвы, высаджваем новыя. А яшчэ — дэкаратыўныя кустарнікі.

За асвятленне вуліц горада і тэрыторый адказвае ўчастак «Гарсвятло». У тым ліку за падсветку будынкаў, святочную ілюмінацыю. Дзейнічае ўчастак па захаванні цвёрдых бытавых адходаў.

Аказваем таксама платныя паслугі па ўкладцы асфальту, абкошванню тэрыторый, высадцы кветак — у асноўным прадпрыемствам, арганізацыям, але можна і прыватным асобам. Пералік паслуг вялікі.

**— Задачы, якія вам даводзіцца вырашаць, даволі сур'ёзныя. Без «жалезных» памочнікаў не абысціся.**

— Дзякуючы падтрымцы з боку гарадскіх улад тэхніка ў нас на прадпрыемстве ёсць. Набываем яе з прыбыткаў і на сродкі бюджэту. Ужо сёлета купілі самазвал-дзесяцітоннік, каб эфектыўна выкарыстоўваць у счэпцы з ім прамысловы пыласос, таксама новы. І набылі палівазапраўшчык — двухсекцыйны, які можа адначасова перавозіць дызельнае паліва і бензін. На яго існуе нават чарга — запраўляем старонніх арганізацыі: дарожнікаў, калгасы і г.д.

Такім чынам, аснашчаны тэхнікай нядрэнна. Калі на планёрках узнімаецца пытанне, што нейкаму ўчастку для работы патрэбна тое ці іншае абсталяванне, стараемся вырашыць аператыўна.

На дапамогу людзям прыйшлі аўтакраны, пагрузчыкі, трактары, здрабняльнік пнёў... Гаспадары даглядаюць іх як мае быць, і на рамонце механізмы падоўгу не затрымліваюцца. Усе зацікаўлены ў тым, каб тэхніка працавала эфектыўна. Знос яе не перавышае 45 працэнтаў. Не многа, тым больш для прадпрыемства, якое функцыянуе з 1968 года. Гэта сведчыць толькі аб тым, што мы стараемся мадэрнізаваць сваю вытворчасць.

Калі для ўборшчыкаў тэрыторыі кожную вясну няпростай задачай было ачысціць рыдлёўкамі прыбардзюрную паласу, уручную пагрузіць смецце з зямлёй у машыны, то зараз гэта далося лягчэй, бо ў асноўным зрабілі з дапамогай механізмаў.

Безумоўна, патрэбнасць у далейшым тэхнічным аснашчэнні ёсць. Але гэтае пытанне вырашальнае.

Дзякуючы, як вы кажаце, «жалезным» памочнікам са сваімі задачамі прадпрыемства спраўляецца.

**— Назавіце прыклады выканання даведзеных параметраў.**

— Скажам, паказчык выручкі ад рэалізацыі прадукцыі ў разліку на аднаго працуючага склаў за першы квартал 3,4 тысячы долараў ЗША, што ў тры з лішкам разы перавышае даведзенае заданне. У паўтара раза перавыканана заданне па росце дадатковых платных паслуг у фактычных цэнах. Перавыкананы заданні па росце заработнай платы, па суадносінах росту прадукцыйнасці працы да заробку, па зніжэнні ўзроўню затрат на вытворчасць прадукцыі ў фактычных цэнах. Па выкананні даведзеных паказчыкаў мы ў ліку перадавых прадпрыемстваў горада.



Сярод разнастайнай тэхнікі ёсць на прадпрыемстве і такая ўнікальная — пыласос для гарадскіх вуліц.

Працуе ў калектыве 349 чалавек. Цёплых слоў у свой адрас заслугоўвае абсалютная большасць. Гэта ўборшчыкі тэрыторыі Іна Аляксандраўна Тарара і Наталля Антонаўна Лукіна, рабочыя зялёнага будаўніцтва Ірына Васільеўна Марозава і Андрэй Уладзіміравіч Касач, вадзіцелі пагрузчыка Сяргей Пятровіч Іспянкоў і Мікалай Віктаравіч Окаракаў, майстар па рамонце гумавых вырабаў Аляксей Сяргеевіч Барчук, вадзіцель Міхаіл Уладзіміравіч Давыдзенка, машыніст аўтагрэйдара Ігар Уладзіміравіч Іваненка і яго калега Сяргей Пятровіч Лабыр, трактарыст Яўген Віктаравіч Смяян і машыніст бульдозера Юрый Дзмітрыевіч Селівоха, грузчык Васіль Канстанцінавіч Вялюга і ўборшчык памяшканняў Ірына Валер'еўна Піваварчык — пералік можна прадаўжаць.



Перад святам горада на вуліцах Наваполацка з'явіліся новыя прыгожыя кветнікі і клумбы. Гэты здымак быў зроблены там, дзе высаджвалі кветкі майстар участка Вольга СЫРАМАХА, работніцы Алеся СЕДЗІНА і Ларыса БУРАК.

Мы працуем для людзей. І не можам дазволіць сабе працаваць у горадзе Наваполацку дрэнна. За якасцю работ сочыць вытворча-тэхнічны аддзел. Распрацавана сістэма заахвочвання. За выкананую якасна і ў тэрмін работу выплачваецца павышаная прэмія. Кожны год да Дня камунальніка падводзяцца вынікі года, вызначаюцца лепшыя працоўныя калектывы, лепшыя працаўнікі, і яны заахвочваюцца.

Калектыў у нас — сямейны, у тым сэнсе, што старэмся жыць адной сям'ёй. Імкнёмся адзін аднаму дапамагаць, і адносіны ў калектыве здаровыя. Людзі хочуць ісці на працу, а гэта — важна.

_Ад рэдакцыі._ Зусім нядаўна кіраўніку спецаўтабазы споўнілася 50. Цудоўная дата, з якой мы і віншуем Юрыя Аляксандравіча. Праца калектыву, які вы ўзначальваеце, у многім вызначае твар горада. Няхай гэты твар заўсёды застаецца такім жа прывабным.

УНП 391487274

**АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ ДЗЕЙНАСЦІ КАЛЕКТЫВУ**

**1. Здабыча вады і давядзенне яе якасці да нарматыўных патрабаванняў у адпаведнасці з СанПіН 10-124 РБ 99 і ГН 10-117-99.**
**2. Транспартаванне пітной вады спажыўцам.**
**3. Прыём і транспартаванне сцёкавых водаў на ачышчальныя збудаванні.**
**4. Абслугоўванне ўнутрыквартальных цеплавых сетак, сетак дажджавой каналізацыі, кабельных ліній нізкага і высокага напружання, гарадскіх фантанаў і лазняў.**

# ЖЫЦЦЯТВОРНАЯ СІЛА ВАДЫ

**Адзін з перадавых калектываў горада — вытворчае камунальнае ўнітарнае прадпрыемства «Наваполацкводаканал», якое ўзначальвае Аляксей ЛАРЫН. Сёння Аляксей Генадзевіч — суразмоўца карэспандэнтаў «Звязды».**



**ПРАДСТАЎЛЯЕМ СУРАЗМОЎЦУ**

Аляксей Генадзевіч родам з Расіі, але ў Беларусі жыве даўно і лічыць сябе чалавекам мясцовым. Прыехаў сюды ў 1978 годзе разам з маці, якая была запрошана на работу ў Наваполацкі політэхнічны інстытут. Зараз яна — дацэнт, кандыдат навук.

Закончыў Наваполацкі політэхнічны інстытут па спецыяльнасці «Водазабеспячэнне і каналізацыя» і прыйшоў на працу ў «Водаканал». Пачынаў з пасады начальніка цэха водазабору і водаачышчальных збудаванняў, потым працаваў галоўным інжынерам прадпрыемства, намеснікам генеральнага дырэктара, генеральным дырэктарам КУП ЖКГ. Пасля рэарганізацыі вярнуўся ў родны калектыў і ўзначаліў яго.

Пра сябе гаворыць так: «Лічу сябе стапрацэнтным камунальшчыкам, усё свядомае жыццё прысвяціў камунальнай гаспадарцы горада Наваполацка. Гэта тое, што мне блізкае і роднае. Як і, спадзяюся, маім калегам».

Узнагароджаны Знакам «Ганаровы работнік жыллёва-камунальнай гаспадаркі».

— Новапалачане ганарацца сваёй вадой, — пачынае гутарку Аляксей Генадзевіч. — Забеспячэнне Наваполацка вадой з 1991 года ажыццяўляецца з водазабору «Акунёва», які знаходзіцца ў 18 кіламетрах ад горада, на возеры Акунёва. Там прабураны 42 артэзіянскія свідравіны на глыбіню ад 110 да 180 метраў, якія ажыццяўляюць падачу вады па трубаправодах да станцыі абезжалезвання. Яе прадукцыйнасць — каля 90 тысяч кубаметраў за суткі. Сёння гораду патрэбна менш, значыць, існуе запас магутнасцяў па ачыстцы вады.

**— Раскажыце, Аляксей Генадзевіч, якім чынам дасягаецца высокая якасць вады для горада?**

— Першапачатковая колькасць жалеза ў ваданосным пласце складае да 5 мг на метр кубічны, у выніку ачысткі маем 0,1 мг на літр пры ПДК 0,3 мг на літр. А даволі часта маем толькі тое, што называецца «слядамі жалеза».

Такую вось сур'ёзную велічыню здымаем на нашых ачышчальных збудаваннях з дапамогай тэхналогій, у аснове якіх ляжыць выкарыстанне кварцавага пяску. Усяго некалькі радовішчаў такога пяску ёсць у Расіі, адкуль мы яго і атрымліваем. Дасыпка выконваецца пяском з кар'ера Мікашэвіцкага ААТ «Граніт».

Што датычыць абеззаражвання, то мы прайшлі як бы некалькі стадый гэтага працэсу. Спачатку згодна з праектам выконвалі яго з дапамогай вадкага хлору. Калі хімічна небяскрыўдны аб'ект апынуўся ў раёнах жылой забудовы — з-за хуткага тэмпу пашырэння межаў горада, перайшлі на выкарыстанне больш бяспечнага дыяксіду хлору на нямецкім абсталяванні. Гэтая тэхналогія выкарыстоўвалася прыкладна пяць гадоў. Але рэагенты для такога віда абеззаражвання вельмі дарагія, даводзілася набываць іх за мяжой за валюту. І ў апошнія гады выкарыстоўваем вадкі гіпахларыд натрыя, які атрымліваем у Расійскай Федэрацыі.

У выніку бактэрыяльныя паказчыкі адпавядаюць СанПіНу, ніякіх тэхналагічных, скажам так, пахаў у вады няма, яе можна спакойна піць з-пад крана і не баяцца. Водаправодная вада сертыфікаваная, мы ў ліку першых у рэспубліцы, яшчэ ў 2001 годзе, атрымалі сертыфікат адпаведнасці. Пазней былі атрыманы так званыя дэкларацыі аб адпаведнасці патрабаванням санітарных нормаў і правілаў. А больш за пяць гадоў таму для ўмацавання даверу з боку спажыўца распрацавалі і ўкаранілі сістэму менеджменту якасці СТБ ІСО 9001-2001. Так што якасць, чысціня вады пацверджана дакументамі розных узроўняў.

На варце якасці — і даволі буйная акрэдытаваная лабараторыя, якая дзеліцца на некалькі структурных падраздзяленняў. Лабараторыя хіманалізаў размяшчаецца на станцыі абезжалезвання, яе дзяжурная служба працуе кругласутачна. А пастаянны, больш разгорнуты аналіз выконваецца на працягу ўсяго рабочага дня. У канцы мінулага года ўласнымі сіламі завяршылі рамонт будынка ў раёне завода БВК, і на другім яго паверсе зараз функцыянуе цэлы комплекс сучасных лабараторый, аснашчаных па апошнім слове тэхнікі — там размясціліся бактэрыялагічная лабараторыя і лабараторыя сцёкавых водаў. Адпаведная служба ёсць у гарадскім пасёлку Баравуха.

Нейкіх рэзкіх змяненняў якасці вады ў нас не бывае, невялікія адхіленні звязаны з сезонам. Ваданосныя гарызонты рэагуюць на таянне снегу, на паводкі, паступленне рачных водаў падчас «вялікай вады». Гэта трохі пагаршае зыходныя параметры, але мы з гэтым спраўляемся. Перавышэння гранічна дапушчальнай канцэнтрацыі не назіраецца.

**— Тэхнічны прагрэс у галіне даволі імклівы. Наколькі вы паспяваеце тэхнічна пераўзбройвацца?**

— Нашы тэхналогіі грунтуюцца на выкарыстанні сучаснага абсталявання. Увесь тэхналагічны працэс водазабеспячэння і водаадвядзення горада вядзецца і кантралюецца АСУ ТП на базе ПТК «Сірыус» у рэжыме рэальнага часу. Дзяжурны персанал бачыць кантрольныя паказчыкі, счытвае тэхнічную інфармацыю з усяго тэхналагічнага комплексу і можа рэгуляваць падачу вады з водазабора, аператыўна рэагаваць на любую сітуацыю. Гэта надзейная сістэма, якую мы ўкаранілі аднымі з першых у рэспубліцы.

Працэс тэхпераўзбраення, мадэрнізацыі і звязанага з ёю энергазберажэння можна назваць перманентным, бо ён ніколі не спыняецца. Прадпрыемства, калі яно хоча развівацца, мусіць займацца гэтым пастаянна. Мы аднымі з першых, яшчэ ў 1997 годзе ўкаранілі на помпавай станцыі трэцяга пад'ёму частотна рэгулюючы прывад (частотны пераўтваральнік) SAMI — F вытворчасці фінскай фірмы АВВ, які дазволіў падтрымліваць у водаправоднай размеркавальнай сетцы пастаянны ціск, пазбегнуць гідраўдараў і мякка, ашчадна эксплуатаваць разводзячую сетку горада, пры гэтым адчувальна эканоміць электраэнергію. Бо зменшыліся колькасць парываў на сетках, колькасць уцечак і адпаведна — затраты на аварыйна-аднаўленчыя работы.

Зараз частотнікамі аснашчаны ўсе каналізацыйна-помпавыя станцыі. На іх мы пачалі прымяняць прыстасаванне плаўнага пуску.

Прымяняем новыя тэхналогіі і ў правядзенні аварыйна-аднаўленчых работ. Адна з асноўных задач — устараненне аварыйных сітуацый у максімальна кароткі час. Набываем для гэтага новую тэхніку, якая дапамагае мінімізаваць затрачаны час. Раней, калі мы знаходзіліся ў складзе КУП ЖКГ і не з'яўляліся самастойнай юрыдычнай асобай, рашэнне гэтых пытанняў давалася складаней. За паўгода самастойнага жыцця ўдалося за кошт уласных сродкаў набыць новы экскаватар, трактар «Беларус», самазвал «МАЗ». У планах — далейшае абнаўленне аўтамабільнага парка. Закупілі сучасныя генератарныя ўстаноўкі, сучасную водапампоўную тэхніку, якая выкарыстоўваецца пры правядзенні аварыйна-аднаўленчых работ. Набылі каля шасці адзінак новага помпавага энергазберагальнага абсталявання, устанаўліваем яго на водазаборы. Імкнёмся ўкараняць усе навінкі, што з'яўляюцца ў галіне.

Так што развіваемся, бачым далейшыя перспектывы. І бачым свае «вузкія месцы», ліквідуем іх.

**— Пагаворым на яшчэ адну актуальную тэму — зніжэнне спажывання вады. Хоць гэта вам як бы эканамічна і не выгадна.**

— Тым не менш па эканоміі клапоцімся. Зараз 98 працэнтаў жыллёвага фонду горада аснашчаны прыборамі ўліку вады. Іх устаноўка дала першую хвалю эканоміі. Насельніцтва пачало больш ашчадна падыходзіць да спажывання вады. Асабліва калі была ўведзена дыферэнцаваная аплата за паслугі водазабеспячэння і каналізацыі. Эканоміць пачалі і прадпрыемствы, там праводзяцца свае мерапрыемствы ў гэтым кірунку. І ў дынаміцы наглядаецца тэндэнцыя зніжэння спажывання вады ў горадзе.

У Наваполацка свая спецыфіка. Горад малады, прыватны сектар фактычна адсутнічае. Уся катэджная забудова падключана да сістэм каналізацыі і водазабеспячэння. Праўда, ёсць прыватны сектар у гарадскім пасёлку Баравуха, які летась адзначыў сваё 200-годдзе. Гэта прыкладна 500 прыватных домаўладанняў, і там сітуацыя крышку іншая. У нас распрацаваны праект будаўніцтва новага вадавода па прыватнай забудове. Пасля выдзялення сродкаў на будаўніцтва якасная вада прыйдзе і ў прыватныя дамы.

Важна, што ў шматпавярховым горадзе няма праблем з ціскам вады, яна падаецца раўнамерна. Наогул ваду падаём згодна з нарматывамі. І сацыяльныя стандарты па забеспячэнні насельніцтва па сваёй галіне выконваем. Дзякуючы яшчэ і таму, што ёсць падтрымка і поўнае ўзаемаразуменне з гарадскімі ўладамі.

Якія ў нас рэзервы паляпшэння абслугоўвання насельніцтва? На наступны год прадугледжана фінансаванне па праграме «Чыстая вада» — на працяг будаўніцтва каналізацыйнага калектара для ачышчальных збудаванняў завода «Палімір» (другой чаргі). У апошнія гады выдзелены вялікія сродкі з рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў і вядзецца планамерная работа па поўным пераводзе горада на закрытую сістэму гарачага водазабеспячэння — з ЦЭЦ.

Аказваем дадатковыя паслугі насельніцтву — па пракладцы сістэм водазабеспячэння і каналізацыі, па ўстаноўцы тых жа прыбораў уліку, па рамонце аргтэхнікі. Дзейнічае служба «аднаго акна».

**— Толькі за апошні час «Водаканал» двойчы заносіўся на гарадскую Дошку гонару...**

— Прадпрыемства паспяхова выконвае прагнозныя паказчыкі эканамічнага развіцця, павышае фінансавую стабільнасць, сацыяльную абароненасць калектыву. Рост выручкі за першы квартал бягучага года ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года склаў 249 працэнтаў (без уліку дзяржаўных субсідый). Тэмп росту сярэднямесячнай заработнай платы — 153 працэнты пры росце прадукцыйнасці працы 248 працэнтаў. Прыбытак ад рэалізацыі прадукцыі за першы квартал — 688 млн рублёў.

Дабіцца такіх паказчыкаў без удзелу кожнага работніка прадпрыемства было б немагчыма. Працоўны ўклад калектыву высока ацэнены на рэспубліканскім і абласным узроўні. Шэсць чалавек узнагароджаны Ганаровым знакам «Заслужаны работнік жыллёва-камунальнай гаспадаркі». Дваім — І.Я. Зерняковай і А.А. Мацуганаву — прысвоены званні «Чалавек года Віцебшчыны». Работнікі прадпрыемства выходзяць пераможцамі гарадскога штогадовага конкурсу «Залатыя рукі». І гэта чыстая праўда: рукі ў нашых спецыялістаў — залатыя!

УНП 391487287



Начальнік змены Валянціна КРЫЛОВА.



Кантроль якасці вады з дапамогай атамна-адсарбцыйнага спектрометра праводзяць начальнік выпрабавальнай лабараторыі Алена ВОЛКАВА і інжынер-хімік Зінаіда ПЕТРАЧЭНКА.



Начальнік цэха водазабору і водаачышчальных збудаванняў Сяргей КАЛАШНІКАЎ і галоўны інжынер Ірына ЗЕРНЯКОВА на адным з участкаў вытворчасці.

# РАЗАМ З ЛЮДЗЬМІ

## Карэспандэнты «Звязды» гутараць з дырэктарам Наваполацкай ЖРЭА Дзмітрыем Уладзіміравічам ДЗЯМІДАВЫМ.



**Прадстаўляем суразмоўцу**

**Дзмітрый Уладзіміравіч ДЗЯМІДАЎ — палачанін, скончыў Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт.**

**Служыў у органах фінансавых расследаванняў, потым — у органах дзяржаўнай бяспекі.**

**З 2010 года ўзначальвае КУП ЖРЭА.**

**— У вас надзвычай шматпрофільнае прадпрыемства, Дзмітрый Уладзіміравіч. Што ўсё ж галоўнае ў рабоце калектыву?**

— Галоўнае — людзі, якія пражываюць на тэрыторыі нашых домакіраўніцтваў, і павышэнне ўзроўню паслуг, якія аказваем ім. Ёсць дзве лініі паводзін жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Можна сядзець і чакаць, калі людзі самі прыйдуць са сваімі праблемамі. А можна ісці да іх, цікавіцца, што перашкаджае жыць. Нам больш даспадобы другая мадэль, бо так лягчэй папярэдзіць нейкія непажаданыя з'явы.

Захаванне жылфонду — задача шматгранная, і важна не толькі выконваць службовыя інструкцыі, дзе ўсё быццам сказана, але і ставіцца да работы не фармальна. Да тых жа веснавых і асенніх аглядаў жыллёвага фонду ў канцы ацяпляльнага сезона і перад яго пачаткам, калі спецыялісты абходзяць дамы, аглядаюць камунікацыі, дахі, фасады, цеплавузлы, ацэньваюць стан трас і гэтак далей. Па выніках прымаецца рашэнне аб рамонце, прафілактыцы, каб спыніць нейкія негатыўныя працэсы ці пагрозу разбурэнняў.

Што датычыць капітальнага рамонту, то складваецца яго перспектыўны план і затым арганізуецца правядзенне работ. Зараз мы працуем па перспектыўным плане капітальных рамонтаў да 2015 года, стараемся вытрымліваць тэрміны яго выканання, хаця існуюць пэўныя фінансавыя абмежаванні і мы павінны з імі лічыцца.

Тым не менш паказчыкі неблагія. На 2012 год быў даведзены план 17,5 тысячы квадратных метраў рамонту плошчы жылых дамоў, а мы пасля рэканструкцыі, капітальнага рамонту і цеплавой мадэрнізацыі ўвялі ў эксплуатацыю 23,2 тысячы квадратных метраў. Інакш кажучы, стараемся максімальна палепшыць тэхнічны стан нашага жыллёвага фонду.

Сітуацыю ўскладняе тое, што ў неспакойныя 1990-я капітальны рамонт жылля не ажыццяўляўся і з усіх графікаў выпала дзесяць гадоў планамернай работы. А ў кожнага збудавання ёсць тэрмін эксплуатацыі, тэрмін догляду. І сёння мы наганяем упушчанае. Зараз пад капітальны рамонт ідуць пабудовы 1966 і 1967 гадоў «нараджэння». Рухаемся са старой часткі горада, ад пачатку вуліцы Маладзёжнай — там дамы ўжо адрамантаваны. З рамонтам інжынерных сетак і агароджвальных канструкцый, з уцяпленнем. Паступова прасоўваемся ў бок больш маладых раёнаў.

Капітальны рамонт праводзім без адсялення жыхароў. Адзін год замяняем крышу, другі — каналізацыю, сантэхніку, ацяпленне, а потым, калі неабходна, праводзім цеплавую мадэрнізацыю. З насельніцтвам даводзіцца шчыльна працаваць. Перад пачаткам рамонту праводзяцца сходы. З жыхарамі заключаем дагаворы, дзе ўсё падрабязна распісана — аб'ёмы работ, тэрміны выканання, час, у які гаспадар пускае да сябе рамонтнікаў. А ад нашай рамонтна-будаўнічай службы патрабуецца дакладнасць, абавязковасць, якасць работы. На аб'ектах пастаянна знаходзяцца майстры. Не скажу, што абыходзіцца наогул без скаргаў, бо работы працаёмкія і, што называецца, пыльныя. Вядзецца і замена падлогі, і замена той жа сантэхнікі — а гэта звязана з нязручнасцямі для гаспадароў. Але скаргі зведзены да мінімуму. У некаторых выпадках прапануем людзям пераехаць часова на кватэру падменнага фонду, але яны на гэта не ідуць. Таму стараемся ўсё планаваць такім чынам, каб жыхары дакладна ведалі, калі наша брыгада будзе ў іх працаваць і колькі часу гэта зойме, каб адпрасіцца з работы ці проста быць дома.

**— Якім чынам вам удалося пазбегнуць вялікай уцечкі кадраў падчас параўнальна нядаўняга масавага выезду спецыялістаў будаўнічых прафесій на заробкі ў Расію?**

— Дыферэнцыравана падышлі да аплаты работы спецыялістаў вядучых прафесій, уводзілі надбаўкі па катэгорыях. І захавалі калектыў, яго патэнцыял. Таму 95 працэнтаў бягучых рамонтаў і 25 працэнтаў капітальных рамонтаў выконваем сваімі сіламі, каб не аддаваць грошы іншым арганізацыям. Аб'ёмы значныя, у тым ліку ў грашовым выражэнні. Толькі дзякуючы таму, што шмат робім самі, планы па капітальным рамонце выконваем і перавыконваем, і пры гэтым дасягаецца значная эканомія сродкаў у параўнанні з тым, калі запрашаць на гэтыя аб'екты падрадныя арганізацыі. Скажам, за 2012 год выканалі гаспадарчым спосабам работ на 12,1 млрд рублёў, у тым ліку на 6,5 млрд — па капітальным рамонце і рэканструкцыі.

Калі асвоілі новую для сябе нішу, то ўзяліся нават за шэраг будаўнічых аб'ектаў горада. Працавалі на рамонце такога важнага сацыяльнага аб'екта, як гарадская бальніца. Былі генпадрадчыкамі на цэнтры сацыяльнай абароны, атрымаўся цудоўны аб'ект, не сорамна было здаваць яго ў прысутнасці міністра працы і сацыяльнай абароны РБ.



Рамонт дарожнага пакрыцця з дапамогай асфальта-бетоннай устаноўкі «Тайфун».

**— У вашы абавязкі ўваходзіць не проста догляд жылля, а «кіраўніцтва жыллёвым фондам». Тут ёсць розніца?**

— Актыўна вядзецца прыватызацыя жылля, у Наваполацку яе паказчык наблізіўся да 85 працэнтаў. Разам з прыватызаванай кватэрай новыя ўласнікі атрымліваюць правы на нейкую частку інфраструктуры — у грашовым выражэнні гэтай долі. І патрэбна не проста старацца паспяваць нешта адрамантаваць, а з удзелам новых гаспадароў сапраўды вельмі граматна ўпраўляць эксплуатацыяй. Каб самі гаспадары не запускалі кватэры, пад'езды, дах, лесвічныя маршы да такога стану, калі ўжо і рамантаваць няма чаго. Вось гэта новыя ўласнікі павінны разумець. На сходах, сустрэчах, праз сродкі масавай інфармацыі мы тлумачым ім: гэта ўсё — ваша ўласнасць, і беражыце яе, як і кватэры. У ідэале мы ўсе разам, і жыхары, і эксплуатуючыя арганізацыі, займаліся гэтым і раней, толькі зараз узровень адказнасці іншы, узраслі патрабаванні.

Існуе закон «Аб сумесным домакіраванні», які прадугледжвае шэраг арганізацыйных формаў. Жыхары могуць аб'яднацца і стварыць жыллёвы кааператыў ці таварыства ўласнікаў. На той частцы жыллёвага фонду, дзе гэтага няма, дзяржава мае права прызначыць кіруючую арганізацыю. У нас у горадзе такой кіруючай кампаніяй з'яўляецца ЖРЭА. А на частцы дамоў існуюць і тыя арганізацыйныя формы, пра якія я гаварыў, — таварыствы ўласнікаў і каля 70 кааператываў.

**— Свае кіруючыя функцыі вы найчасцей ажыццяўляеце праз домакіраўніцтвы. І яны альбо забяспечваюць поспех, альбо наадварот. Іх работнікі перш за ўсё маюць стасункі з насельніцтвам і павінны быць не толькі майстрамі сваёй справы, але і людзьмі кантактнымі, нават добрымі псіхолагамі. Як на самой справе?**

— У нас у структуры восем домакіраўніцтваў — сем у горадзе і адно ў Баравусе. Працуе ў іх да ста чалавек. Асноўная маса — гэта рабочыя: слесары, сантэхнікі, рабочыя комплекснага прыбірання (дворнікі), сталяры, электрыкі... Ёсць інжынеры, майстры — у залежнасці ад колькасці жыхароў. З кадрамі сітуацыя дастаткова стабільная, хоць заўсёды вялікі клопат пра кадры кіраўнікоў. Гэта той залатнік, які невялікі, але дарагі. Добры домакіраўнік «замыкае» ўсе пытанні на сабе, а калі сказаць больш правільна — кантралюе ўсе пытанні, якія знаходзяцца ў яго веданні, і ўмее арганізаваць вытворчы працэс граматна, эфектыўна.

**— Служба ваша створана для насельніцтва, Дзмітрый Уладзіміравіч. А ці ўдаецца працаваць разам з насельніцтвам, у яго ж інтарэсах?**

— З насельніцтвам працуем праз дамавыя камітэты, якія створаны ва ўсіх дамах. У іх склад на агульных сходах уключаюцца, як правіла, найбольш актыўныя жыхары. Выбіраюцца саветы мікраранёнаў — таксама з людзей з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй. І калі гэтыя грамадскія фарміраванні створаны не фармальна, з імі працаваць лёгка. У нас пачатак любой важнай работы — капітальны рамонт, правядзенне суботніка ці проста добраўпарадкаванне тэрыторыі, пераабсталяванне дзіцячых гульнявых пляцовак — не абыходзіцца без папярэдняй прапрацоўкі гэтага пытання з дамавым камітэтам ці саветам мікрараёна. Бо да гэтага былі выпадкі, калі праклалі па дворы асфальтаваную дарожку, а жыхары замест падзякі абураюцца: маўляў, нам зручней хадзіць інакш... І мы павінны прыслухоўвацца. З гэтай мэтай рэгулярна праводзім «Дні адкрытых дзвярэй», хаця нашы дзверы заўсёды адкрытыя. Дарэчы, неабходна адзначыць паступовае зніжэнне колькасці зваротаў грамадзян, а гэта ўжо паказчык якасці паслуг, якія мы ім прадастаўляем.

Важна і тое, што на працягу апошніх гадоў сістэмная работа нашага прадпрыемства дазволіла дасягнуць значнага скарачэння дэбіторскай запазычанасці насельніцтва за жыллёва-камунальныя паслугі.

Жыхары ідуць нам насустрач, удзельнічаюць у мерапрыемствах, якія мы праводзім. Штогод праходзіць гарадскі агляд-конкурс на лепшае добраўпарадкаванне дваровай тэрыторыі. Домакіраўніцтвы рыхтуюць яго разам з дамавымі камітэтамі і жыхарамі. Яны дапамогуць разбіць клумбы, пафарбаваць лаўкі... Важна, што ў дварах, дзе з жыхароў сфарміраваўся нефармальны калектыў, не назіраецца нейкіх актаў вандалізму ў дачыненні да грамадскай ці асабістай маёмасці.

Актывістаў мы стараемся заахвоціць, кіраўніцтва горада ўзнагароджвае іх ганаровымі граматамі, уручае каштоўныя падарункі. Асабліва калі падводзяцца вынікі гарадскіх аглядаў-конкурсаў. Наталля Іванаўна Качанава вельмі раўніва адносіцца да работы з грамадскімі фарміраваннямі, тымі ж дамавымі камітэтамі, рэгулярна праводзіць сустрэчы з імі. Тады ідзе сустрэчны паток інфармацыі — з пажаданнямі, заўвагамі.

Калі на Беларусь абрушыўся снежны ўраган Хаўер, новапалачане даволі хутка справіліся з яго наступствамі. У нашым горадзе гэтая работа была ўжо скончана, а тэлебачанне працягвала паказваць, як наводзяць парадак у іншых гарадах.

**— ЖРЭА выйшла на бясстратны ўзровень гаспадарання. Якім чынам?**

— Выконвалі даведзеныя паказчыкі па прадукцыйнасці, ды і ўсе іншыя. Ніякіх сакрэтаў няма. У нас даволі шырокі пералік платных паслуг, якія аказваюцца насельніцтву. Гэта і станцыя тэхнічнага абслугоўвання прыватных аўтамабіляў, і дрэваапрацоўка, значны ўклад уносіць рамонтна-будаўнічая група... Шэраг кірункаў быў стратным. Правялі аналіз, дадаткова вывучылі попыт, рэальна ацанілі сітуацыю і пастараліся выправіць становішча. Безнадзейна стратныя кірункі ліквідавалі і сканцэнтраваліся на тых, якія прыносяць прыбытак. У 2012 годзе платных паслуг насельніцтву аказалі на 183 працэнты больш, чым у 2011-м. У нас ёсць брыгада, якая добрасумленна выконвае рамонт любой складанасці ў кватэрах — «пад ключ», і заяўкі на іх ідуць пастаянна. Карыстаюцца попытам малярныя работы і паклейка шпалерамі, якія выконваюцца ЖЭСамі. І на гэтых дзяўчат людзі запісваюцца ў чаргу. Ёсць паслугі па грузаперавозках, бо маем каля 40 адзінак тэхнікі — аўтамабілі, у тым ліку самазвалы, лесавоз, трактары, вышкі. Паслугі па скошванні газонаў, дастаўцы грунту і кампостаў. Плюс аўтастаянкі, выраб сталяркі, рамонт электрапліт, устаноўка вокнаў, можам печку скласці... Фактычна можам задаволіць любую просьбу чалавека. Заканадаўства дазваляе частку прыбытку, які паступае ад аказання паслуг прыватнага характару, выплачваць сваім работнікам. І гэта неблагі стымул.

За нашы паслугі насельніцтва разлічваецца не «налічкай». Рахунак уключаецца ў «жыроўку» — так зручней.



Брыгадзіра слесараў-сантэхнікаў і электрыкаў, былога воіна-інтэрнацыяналіста Ігара ЕРМАЛАЕВА многія жыхары часцей бачаць у спецвопратцы, на якой узнагароды не носяць. На гэтым фотаздымку побач з партрэтам нашага героя — атрыманая ім прафесійная ўзнагарода — знак «Ганаровы работнік жыллёва-камунальнай гаспадаркі».

**— Вы перасягнулі і мэтавы паказчык па энергазберажэнні. Не ўсім вашым калегам гэта ўдаецца.**

— Яго выкананне абумоўлена рэалізацыяй мерапрыемстваў па пераводзе жылых дамоў Наваполацка на закрытую схему цеплазабеспячэння з устаноўкай пласцінистых цеплаабменнікаў і рэгулятараў, па ўкараненні аўтаматычных сістэм кіравання асвятленнем месцаў агульнага карыстання ў жылых дамах.

Імкнёмся працаваць эканомна, якасна, бяспечна. Вырашальнае значэнне набываюць кантроль і патрабавальнасць. Яшчэ ў 2010 годзе ўкаранілі сістэму менеджменту якасці на арганізацыю тэхнічнага абслугоўвання і на дзейнасць рамонтна-будаўнічай службы. А зараз будзем атрымліваць міжнародны сертыфікат па ахове працы. Да слова сказаць, па леташніх выніках занялі першае месца ў гарадскім аглядзе-конкурсе на лепшую арганізацыю работы па ахове працы.

Шукаем далейшыя рэзервы паляпшэння работы. У нас дзейнічае аварыйна-дыспетчарская служба ЖРЭА, і ў домакіраўніцтвах ёсць свае дыспетчары. На будучае, каб пазбегнуць дубліравання, збіраемся стварыць адзіную такую службу — цэнтралізаваную дыспетчарскую, куды будзе паступаць інфармацыя не толькі ад насельніцтва. У нас у планах аснасціць увесь жылфонд сістэмай маніторынгу, якая будзе кантраляваць цеплапункты, падвалы, на ёй будзе «завязана» ахоўная сігналізацыя. І туды ж паступяць усе заяўкі як аварыйнага характару, так і па платных паслугах. Каб усё ішло ў адзіны цэнтр і размяркоўвалася па відах работ, па тэрмінах і выканаўцах.

УНП 300296697

***(Заканчэнне падборкі на стар. 6)***





Многія жылыя двары і дзіцячыя пляцоўкі горада ўпрыгожаны драўлянымі скульптурамі. Іх аўтар — рэзчык па дрэве Аляксандр КНЫРКО.

# ПЛАНЕТА ТАЛЕНАВІТАГА ДЗЯЦІНСТВА

***На нядаўняй сустрэчы з адоранымі навучэнцамі, студэнтамі, таленавітай моладдзю Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: у Беларусі ёсць усе ўмовы, каб моладзь змагла сябе рэалізаваць.***

Расціць талент у школе... Як не прапусціць, своечасова заўважыць і выпеставаць таленавітага, шматабяцальнага вучня? Размова на гэтую тэму адбылася ў аддзеле адукацыі Наваполацкага гарвыканкама. Удзел у ёй прынялі галоўны спецыяліст Надзея Ляхава — яна курыруе пытанні дашкольнай адукацыі, загадчыца вучэбна-метадычнага кабінета Валянціна Дзямідава і Алеся Шарлай — галоўны спецыяліст, куратар агульнай сярэдняй адукацыі.



Заняткі ў эксперыментальным класе гімназіі №1 праводзіць настаўнік вышэйшай катэгорыі Наталля КАНДРАЦЬЕВА.

**Н.Л.** Творчыя здольнасці праяўляюцца ў дзіцяці ўжо ў раннім узросце, у садку. І гэта адразу відаць: добра малюе, прыгожа спявае, лёгка лічыць...

**В.Д.** А ўжо ў школе на ўроках любы настаўнік, тым больш вопытны педагог, убачыць дзіця, якое задае незвычайныя, нестандартныя пытанні. Яно шмат чым цікавіцца, а не проста паслухмяна ідзе за плынню ўрока.

**Н.Л.** Асобасна-арыентаваная мадэль адукацыі і разлічана на тое, каб не нівеляваць усіх дзетак пад адзін грабеньчык, а ўлічваць асаблівасці кожнага, пачынаючы з дзіцячага садка. Апошнім часам у горадзе штогод праходзіць фестываль «Наваполацк — планета дзяцінства». І кожная дашкольная ўстанова паказвае найбольш яркія нумары дзіцячай самадзейнасці. Найбольш таленавітыя маленькія выканаўцы ў далейшым запрашаюцца са сваімі нумарамі для ўдзелу ў гарадскіх святах.

**А.Ш.** З неардынарным вучнем настаўнік і будзе працаваць па-асабліваму. Магчыма, крыху больш патрабавальна. Ён уключае такіх дзяцей у разнастайныя віды дзейнасці. Гэта і конкурсы, і алімпіядны рух, і фестывалі. Калі ж дзіця са спартыўнымі задаткамі — ёсць круглагадовыя спартакіяды. Калі праяўляюцца паэтычныя здольнасці ці задаткі мастака — то літаратурныя конкурсы, выстаўкі малюнкаў і г.д. Кажучы пра інтэлектуальную адоранасць маленькага чалавека, можна заўважыць, што з боку аддзела адукацыі створаны ўмовы, каб дапамагчы настаўніку ўключыць дзіця ў працэс творчасці, нават творчага спаборніцтва. Возьмем тыя ж алімпіяды. У нас у горадзе яны пачынаюцца з чацвёртага класа. У ходзе іх мы як бы загартоўваем сваіх «зорачак», рыхтуем да рэспубліканскіх алімпіяд.

У горадзе створана школа для адораных дзяцей «Шлях да Алімпа». Лепшыя педагогі горада, педагогі-майстры падрыхтавалі тут не адно пакаленне алімпіяднікаў і паспяховых выпускнікоў.

**В.Д.** У гарадскіх школах развіты даследчы кірунак дзейнасці дзяцей. Праводзяцца гарадскія канферэнцыі даследчых работ вучняў. Там сустракаюцца вельмі цікавыя праекты. Сёлета на канферэнцыі было прадстаўлена ў розных секцыях больш за 200 работ. Лепшыя з іх прымуць удзел у абласной і рэспубліканскай канферэнцыях.

**А.Ш.** Сёлета вучні нашых школ заваявалі дзесяць дыпломаў на заключным, рэспубліканскім этапе (летась было восем). З абласнога прывезлі 54 дыпломы. Лічбы сведчаць пра даволі масавы ўдзел дзяцей у гэтым творчым спаборніцтве.

**В.Д.** У папярэднія гады ў нас былі і прызёры міжнародных алімпіяд. Напрыклад, такіх, як алімпіяда школьнікаў саюзнай дзяржавы «Расія і Беларусь — гістарычная і духоўная супольнасць». Наш Дзіма Арашкевіч — выпускнік 14-й школы, стаў бронзавым прызёрам 5-й міжнароднай алімпіяды навук аб Зямлі. Былі прызёры міжнародных алімпіяд па астрафізіцы — напрыклад, выпускнік ліцэя Рыгор Іваноў, і іншыя.

**Н.Л.** Дзве дашкольныя ўстановы горада з'яўляюцца ўдзельнікамі міжнароднага конкурсу «Адысея розуму». Не зусім тыпова для дашкольнікаў, але ў нас, як бачыце, такія прыклады ёсць.

Карэспандэнт. Вучыцца нестандартна мысліць дапамагае камп'ютар?

**А.Ш.** Існуе эксперыментальны клас, дзе навучанне праводзіцца з дапамогай нэтбукаў. Эксперымент стаў магчымым дзякуючы падтрымцы Парка высокіх тэхналогій. У гэты клас існуе конкурс, бо шмат ахвотных вучыцца ў ім.

Акрамя таго, у горадзе на базе ліцэя створаны дзігітальны (ад слова «лічба») цэнтр ІТ-Акадэмія «НОТА». Нехта атрымлівае тут самыя першыя навыкі работы на камп'ютары, працы ў інтэрнэце, з рознымі праграмамі, а нехта ўжо ўдзельнічае ў кубках праграмавання. І дасягае высокіх вынікаў — як Сяргей Азараў, які стаў пераможцам заключнага этапу алімпіяды па інфарматыцы.

**Н.Л.** У чатырох дашкольных установах абсталяваны камп'ютарныя класы. Там дзеці атрымліваюць элементарную камп'ютарную граматнасць. Паралельна даюцца тлумачэнні і бацькам: колькі іх дзіця можа займацца за камп'ютарам без шкоды для здароўя, якія існуюць сайты для малых і школьнікаў і гэтак далей. Галоўнае — каб камп'ютар быў саюзнікам бацькоў і школы ў выхаванні і навучанні.

Карэспандэнт. Ці заахвочваеце вы нейкім чынам педагогаў, якія гадуюць таленты?

**А.Ш.** Штогод праходзіць ушанаванне пераможцаў абласнога і рэспубліканскага этапаў алімпіяд і іх педагогаў, яны атрымліваюць грашовыя прэміі, якія выдзяляе гарвыканкам. Падзея адбываецца ва ўрачыстай абстаноўцы, запрашаем на яе вядомых, паважаных людзей, прэміі ўручае мэр горада. Мерапрыемства шырока асвятляецца ў мясцовым друку, у перадачах гарадскога тэлебачання. Горад выходзіць з хадайніцтвам, каб пераможцы рэспубліканскага этапу сталі стыпендыятамі прэзідэнцкага фонду, і даволі часта атрымлівае падтрымку і разуменне.

**В.Д.** У нас ёсць гарадская Дошка гонару, якая называецца «Майстры педагагічнай працы». На яе заносяцца настаўнікі-наватары, якія са сваімі дзецьмі змаглі дабіцца найбольшых поспехаў — у алімпіядах, у канферэнцыях, іншых творчых конкурсах.

**Каментарый загадчыка аддзела адукацыі Алега БУЕВІЧА:**

— Тое, пра што вёў размову кіраўнік краіны на сустрэчы, — гэта праграма дзеянняў для ўсіх нас.

Наваполацк — горад таленавітых, крэатыўных, шчырых дзяцей. Хочацца дабавіць яшчэ некалькі прыкладаў, якія сведчаць пра іх таленавітасць і грамадскую актыўнасць. Скажам, удзел у рэалізацыі міжнароднай ініцыятывы «Горад, прыязны да дзяцей». Альбо заняткі ў гарадскім цэнтры ўстойлівага развіцця і экатурызму, у білінгвістычных секцыях гімназіі № 1. Удзел у сяброўскіх стасунках з адукацыйнымі ўстановамі Расіі, Украіны, Літвы, Латвіі, Францыі. А таксама ў рабоце рэгіянальнага рэсурснага цэнтра комплекснай падтрымкі адукацыі ў інтарэсах устойлівага развіцця на базе СШ № 12.

У гэтым шэрагу і гарадскі парламент дзяцей і моладзі з яго ініцыятыўнымі прапановамі да гарадскіх улад, дзіцячае тэлебачанне Палаца дзяцей і моладзі, пошукавыя атрады па ўвекавечанні памяці воінаў, загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны, сусветна вядомы хор «Звонкія галасы» і многае іншае.

Усё гэта было б немагчымым без таленту ў дзяцей. Галоўнае — разгледзець іскрынку таленту ў кожным і даць яму развіцца. Для чаго патрэбна штодзённая карпатлівая работа ўсіх разам: педагогаў і бацькоў, мясцовых органаў улады і грамадскіх арганізацый.



**Пераможцы рэспубліканскіх алімпіяд: Аксана ГАРАВЕЦ, Ганна РЫБАЦКАЯ, Ірэна КАПУСТО́ (на пярэднім плане), Сяргей АЗАРАЎ, Уладзіслава БАГРЭЦ, Ілья ЛАБЕЙКА, Яніна ЛУБІНСКАЯ, Віталій КАРАЛЁЎ, Дзмітрый ІЗАІТКА, Марыя ІВАНЬКО.**

УНП 300120236

**БІЯМЕХЗАВОД як юрыдычная асоба быў зарэгістраваны ў жніўні 2003 года. Але па шэрагу прычын будаваўся даволі доўга — па 2010 год уключна. Здалі ў эксплуатацыю пад звон навагодніх курантаў, і з таго часу вядзецца адлік яго біяграфіі.**



Лепшы прасаўшчык Аляксандр СЕВЯР'ЯНАЎ.

# ДУМАЦЬ ПРА ПЕРСПЕКТЫВУ

Першы працоўны год пайшоў на пусканаладачныя работы і адладку тэхналогіі. Бо сыравіна, якая тут перапрацоўваецца — цвёрдыя камунальныя адходы (ЦКА), даволі складаная па сваім марфалагічным саставе.

Нават спатрэбілася выклікаць прадстаўнікоў завода-вытворцы і ўзгадняць новыя нормы загрузкі абсталявання. А гэта адразу адбілася на аб'ёмах перапрацоўкі.

Працяглы час не вырашалася пытанне фінансавання, і было незразумела, хто павінен плаціць за перапрацоўку (сартыраванне і прасаванне) бытавога смецця, ад якога вымушаны бараніцца нашы гарады. І толькі ў 2011 годзе выйшла інструкцыя Мінжылкамгаса, пасля чаго з'явілася магчымасць атрымання дзяржаўных субсідый.

Дзякуючы прынятым мерам, у тым ліку павышэнню тарыфаў і жорсткай эканоміі, не менш жорсткаму выкананню тэхналагічнай дысцыпліны мінулы год прадпрыемства завяршыла без затрат. (У 2011 годзе іх было 2,8 мільярда рублёў). Што дазволіла павысіць зарплату людзям у два разы і ўтрымаць спецыялістаў.

— Першы квартал гэтага года таксама закончылі без убыткаў, — расказвае дырэктар завода Барыс Расаў. — Наша прадукцыя запатрабавана. Праўда, не ўся, бо ў краіне не ўсе перапрацоўчыя прадпрыемствы прымаюць на перапрацоўку другасную сыравіну.



Пытаннямі экалогіі на прадпрыемстве займаецца інжынер Анастасія БАБІЙ.

Завод працуе 12 гадзін кожны дзень, акрамя нядзелі. Заняты перапрацоўкай усіх ЦКА, якія да нас паступаюць, у тым ліку шкла. Між іншым, на гэты год даведзена вельмі напружанае заданне па шкле — сабраць 1800 тон.

Акрамя таго, мы абсталявалі вытворчы ўчастак па перапрацоўцы рубероідных старых дахаў, і будаўнікі зараз возяць іх нам.

Праводзім тэндар, каб арганізаваць глыбокую перапрацоўку старых аўтамабільных пакрышак і атрымліваць метал, вуглярод і піролізнае масла (інакш кажучы, пячное паліва). Усё гэта знойдзе прымяненне ў народнай гаспадарцы.

***«Калі думаць пра перспектывы, то ўсё ж работу з насельніцтвам варта актывізаваць. Немцы дабіліся цудоўных вынікаў шляхам рэгулявання цэн за здадзеныя адходы. Па законе, у іх забаронена вывозіць ЦКА на палігон. Хочаш — вязі, але заплаціш такі штраф, што ў другі раз не павязеш пад прымусам».***

Летась мы «вызвалілі» Наваполацк ад 44 тысяч тон смецця, і цяпер гораду дыхаць лягчэй. На жаль, пакуль у краіне не наладжана перапрацоўка тэтрапакетаў — адпраўляем іх на палігон.

Сапраўды, мы выйшлі на бясстратны ўзровень работы, — працягвае расказ Барыс Іванавіч. — Але і прыбыткаў асаблівых пакуль няма. І пакуль не выходзім на заяўленую магутнасць, ёсць аб'ектыўныя прычыны. Але дынаміка росту аб'ёмаў выпушчанай прадукцыі станоўчая. Летась выйшлі на паказчык, які перавысіў 10 тысяч тон. На гэты год стаіць задача 15 тысяч тон, і мы яе выканаем. Больш пачалі дабываць з смецця другасных матэрыяльных рэсурсаў (ВМР), што таксама важна.

Аб'явілі тэндар на яшчэ адну сартыравальную кабіну. Яе ўстаноўка і ўвядзенне ў строй дазволіць амаль у два разы павялічыць выхад прадукцыі.

Склалі свой план мадэрнізацыі. Да 2015 года плануем укараніць шмат цікавых навінак. Хутка спынім адпраўку паперы на нашы цэлюлозна-папяровыя камбінаты, зможам перапрацоўваць самі. Плануем і перапрацоўку ПЭТ-бутэлькі ў гранулы, для чаго спатрэбіцца спецыяльная лінія.

Калектыў у нас працаздольны, налічвае больш за 150 чалавек. Завод складаецца з некалькіх участкаў. Асноўны — безумоўна, участак сартавання і драблення. Ёсць участак вывазу ЦКА — сёння можна назваць яго галоўным здабытчыкам грошай, бо вываз смецця нядрэнна аплачваецца. А мы дзякуючы дапамозе выканкама сталі тым самым аператарам, які вывозіць смецце з усяго горада. Плюс участак вывазу буйнагабарытных адходаў і збору ВМР і ўчастак абслугоўвання вытворчасці.

Наладжваем у горадзе раздзельны збор смецця, што дазволіць зменшыць затраты на нашай уласнай вытворчасці.

Перспектывы ў завода ёсць, магутнасці мы павялічым, другаснай сыравіны стане больш. У прынцыпе, ужо зараз можам рэзка павялічыць збор, але тады патрэбна адкрываць новыя прыёмныя пункты і актывізаваць работу з насельніцтвам. Чатыры стацыянарныя і адзін перасоўны пункт, якія працуюць сёння — гэтага мала для статысячнага горада.

І яшчэ. Стаяць па горадзе 295 кантэйнераў для раздзельнага збору, а патрэбна як мінімум 1000. Каб паставіць кантэйнер практычна каля кожнага пад'езда і людзі маглі вынесці пустыя шкляныя бутэлькі, ПЭТ-бутэлькі, поліэтыленавыя пакеты і гэтак далей. Летась мы набылі 74 кантэйнеры, сёлета будзем закупляць яшчэ, але не ведаю, якую колькасць, бо шмат сродкаў ідзе на рамонт абсталявання.

Рашэннем аблвыканкама завод прызначаны абласным аператарам па зборы другасных рэсурсаў. Бліжэйшыя раёны пачалі вазіць адходы да нас. І гэта разумна, бо любой раённай ЖКГ нявыгадна везці тону шкла ў Мінск. А мы адпраўляем яго далей вагонамі на новы буйны завод, што пабудавалі пад Мінскам.

Калі думаць пра перспектывы, то ўсё ж работу з насельніцтвам варта актывізаваць. Немцы дабіліся цудоўных вынікаў шляхам рэгулявання цэн за здадзеныя адходы. Па законе, у іх забаронена вывозіць ЦКА на палігон. Хочаш — вязі, але заплаціш такі штраф, што ў другі раз не павязеш пад прымусам. Усе адходы, усё смецце ідзе толькі на сартавальныя станцыі.

Беларусь пайшла гэтым жа шляхам. У краіне пяць такіх заводаў і хутка пабудуюць новыя.

Так што перспектывы ў гэтым сэнсе нармальныя.

І — адчувальна зменшыцца нагрузка на экалогію.

УНП 390288747

■ Працяг тэмы



На школьным двары красуецца сялянская хата-музей.

# ХТО Ў ХАЦЕ ЖЫВЕ?

Пра гэта цікавіцца кожны на зялёнай палянцы каля наваполацкай сярэдняй школы №5. Вясковы пяцісценак з драўлянымі карункамі над вокнамі ўтульна месціцца ў зацені старых дрэў. Непадалёку, вышэй за зялёныя кроны, красуюцца сучасныя будынкі, а тут — цішыня і адчуванне таго, што час прыпыніўся.

У хаце жыве наша багатае мінулае. Дакладней, маленькая часцінка яго, клапатліва складзеная з рэчаў — сведак побыту нашых прадзедаў. Жыве тут гісторыя, а гаспадараць — дзеці.

Настаўніца гісторыі, кіраўнік школьнага этнамузея «Хата ў жыцці беларуса» Ганна Сугакова расказвае:

— Хата стаіць ужо дваццаць гадоў, і ўвесь гэты час фонды школьнага музея папаўняюцца новымі экспанатамі. Наша мэта — не толькі адшукаць і захаваць узоры спадчыны. Трэба данесці да дзятвы разуменне таго, што музейныя экспанаты — не толькі сведкі мінулага, але і часцінкі з фундаменту сучаснай культуры.

Зразумела, за два дзесяцігоддзі было шмат цікавых пошукавых экспедыцый. Адных толькі старажытных кроснаў у нас цяпер шэсць экзэмпляраў! Вучні з настаўнікамі шукаюць і вывучаюць таксама нематэрыяльную культуру мінулага. У музейных справах мы маем добрыя сувязі з навукоўцамі Дзяржаўнага беларускага музея народнай архітэктуры і побыту ў Строчыцах.

Там, дзе сёння размешчаны горад Наваполацк і яго прамысловая зона, у сярэдзіне мінулага стагоддзя прасціраліся неабжытыя абшары, жылі сваім ціхім жыццём маленькія вёсачкі. Некаторых з іх жыхароў можна сустрэць сёння ў нашым горадзе. З гэтымі старымі знаўцамі былых традыцый мы падтрымліваем сувязі.

Праца настаўнікаў і вучняў адзначалася неаднаразова. Самая высокая ўзнагарода для аматараў-краязнаўцаў — за перамогу ў рэспубліканскім конкурсе этнамузеяў і ўдзел у першым нацыянальным форуме «Музеі Беларусі».



Даша ІЛЬЮХІНА і Алена ДЖЭРЭН з бабуліным вышываным ручніком.



Юны краязнавец Вадзім КАРАВАНЕНКА са старажытнай скрыпкай у руках.

**Публікацыю падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ і Яўген ПЯСЕЦКІ.**

**Ад рэдакцыі. Творчая брыгада шчыра дзякуе за садзейнічанне ў падрыхтоўцы матэрыялаў з Наваполацка галоўнаму спецыялісту ідэалагічнага аддзела гарвыканкама Уладзіміру Яўгенавічу БЯЛЯЕВУ, намесніку дырэктара «Водаканала» Івану Канстанцінавічу КРЫВЕЛЮ, намесніку дырэктара ЖРЭА Мікалаю Раманавічу РАМАНОЎСКАМУ, а таксама ўсім, хто не пашкадаваў часу для разнапланавай і эфектыўнай дапамогі журналістам «Звязды».**



Кіраўнік музея, настаўніца Ганна СУГАКОВА.


**Шаноўныя сябры!**

**Працягваецца падпіска на «Звязду» на III квартал і 2-е паўгоддзе 2013 года!**

**Спадзяёмся і далей бачыць вас сярод нашых чытачоў і падпісчыкаў!**

**Хочам нагадаць вам, што падпіска на «родную газету на роднай мове» можа стаць добрым падарункам родным вам людзям!**

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

| Індэкс/перыяд | 1 месяц | 3 месяцы | 6 месяцаў |
|---|---|---|---|
| 63850 (для індывідуальных падпісчыкаў) | 39 000 | 117 000 | 234 000 |
| 63145 (для ветэранаў ВАВ і пенсіянераў) | 35 100 | 105 300 | 210 600 |
| 63858 (для ведамасных падпісчыкаў) | 78 000 | 234 000 | 468 000 |
| 63239 (ведамасная падпіска для ўстаноў міністэрстваў адукацыі, культуры і аховы здароўя) | 70 200 | 210 600 | 421 200 |


■ Лісты да Жылібера



# Вакол медыцыны са Святланай Дзянісавай

Bonjour, monsieur Jean!

Спяшаюся перадаць Вам той надзвычайны настрой, які стварае сціплы ўзор еўрапейскай флоры — Taraxacum oficinale. Я гатова зараз злавіць сябе на жаданні распавесці гісторыю пра Сонейка, якое неабачліва закахалася ў Воблачка і перастала быць сабой... Ды раскажу іншую.

Значыць, Taraxacum oficinale. Дзьмухавец лекавы нікога ў нас ужо не лекуе. Але ж Вы, monsieur, згадалі б, як гэта адбывалася раней. Стары трактат прапісваў «жаўточкі» кветак дзьмухаўца зварыць у слабасалёнай вадзе, пакачаць у сухарах, абсмажыць на алеі да хрумсткасці. Ці вось яшчэ: арэхі грэцкія змяшаць з алеем і свежым мёдам, дадаць накрышаны ліст дзьмухаўца. Іншыя рэцэпты складаліся з дзьмухаўца з часнаком і лімонам (да іх, дарэчы, таксама пасавалі б падсмажаныя грэцкія арэхі), з дзьмухаўца з вінным воцатам і гарчыцай, аздобленымі драбком цукру, змешанымі з залаціста падсмажанымі колцамі цыбулі і пшанічнымі грэнкамі, з дзьмухаўца і... А навошта Вам гэта расказваць? Вы ж, monsieur Jean, самі ведаеце: каго не вылечвае ўрач, таго вылечвае прырода. Ды толькі апошнім часам мы ад яе, прыроды, так далёка, што, хутчэй, прыдбаем іншую хваробу (ад лекаў, што ратуюць ад першай), чым папярэдзім абедзве здаровым харчаваннем...

Мне Taraxacum oficinale здаецца ледзь не свяшчэнным. Як быццам Сонейка і Воблачка, злучаныя ў адно цэлае, дзьмухавец лекавы, сімвалізуе... напамін. Пра час і шчасце. Што час тым карацей, чым больш шчасця ў сабе змяшчае.

Гэта калі верыць старым трактатам, monsieur Jean. Але, па вялікім рахунку, калі ім хто верыў?..

■ Факт

# ДЗЕЦІ ЖЫВУЦЬ ДОМА

**У Магілёўскай вобласці пераважная большасць дзяцей, якія засталіся з розных прычын без апекі бацькоў, выхоўваецца ў замяшчальных сем'ях, а не ў інтэрнатах.**

На прэс-канферэнцыі ў аблвыканкаме назвалі лічбу: толькі 14% сірот жывуць у інтэрнатных установах, астатнія — у прыёмных і апякунскіх сем'ях, дзіцячых дамах сямейнага тыпу, «СОС — дзіцячай вёсцы». Амаль 2 тысячы хлопчыкаў і дзяўчынак прынялі на выхаванне ў новыя сем'і, і яны ўвогуле развіталіся са сваім сіроцкім статусам.

Паводле слоў намесніка начальніка Магілёўскага абласнога ўпраўлення адукацыі Ірыны Кусковай, год ад года назіраецца памяншэнне сацыяльнага сіроцтва. Ад моманту дзеяння Дэкрэта № 18, які стаў дзейнічаць напрыканцы 2006 года, на 30% скарацілася колькасць дзяцей, бацькі якіх пазбаўлены сваіх правоў.

Дзяржаўныя меры па абароне дзяцей у праблемных сем'ях далі плён: за апошнія гады ў Магілёўскай вобласці ліквідаваны 6 інтэрнатаў, прычым адзін з іх, у Круглянскім раёне, летась. Засталіся толькі 4 падобныя ўстановы, дзе выхоўваецца каля паўтысячы дзяцей-сірот.

Разам з тым, павялічваецца колькасць дзіцячых дамоў сямейнага тыпу. Цяпер іх у рэгіёне 40, і там выхоўваюцца 300 дзяцей. Сёлета такія новыя дамы з'явяцца ў Магілёўскім раёне і Бабруйску.

**Ілона ІВАНОВА.**

## Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ, тэл. 287 18 27.

№ 16 (474)

## САД У ЧЭРВЕНІ



**Калі на маладых дрэвах яблыні і грушы ўтварылася шмат завязі, неабходна яе прарэдзіць. Гэта робіцца з дапамогай нажніц. У кожным суквецці трэба выразаць усе завязі, пакінуўшы адну, самую буйную. Адлегласць паміж дзвюма суседнімі завязямі на галінцы павінна быць не менш за 10 сантыметраў. А аптымальная колькасць лісця на кожны плод — каля 25—30 штук. Пры такім нарміраванні можна атрымаць восенню буйныя плады яркай афарбоўкі.**

У канцы чэрвеня з'яўляецца першая падаліца з пашкоджаннем пладоў яблыневым пільшчыкам, а крыху пазней — з пашкоджаннем пладоў яблыневай пладажэркай. Трэба трохі страсянуць шкілетныя галіны і неадкладна сабраць апад з вусеняў. Гэтыя пашкоджаныя плады трэба змясціць у гарачую ваду або газу. Апад з гэтага часу неабходна збіраць кожны дзень.

На ягадных кустах завязь штодня павялічваецца, і галінкі пад яе цяжарам апускаюцца да зямлі. Пад іх трэба паставіць рэечны каркас, зрабіць мацаванне галінак у выглядзе парасоніка ці паставіць індывідуальную падпорку пад кожную галінку. Пры гэтым куст будзе лепш праветрывацца, а часцінкі глебы не будуць трапляць на ягады ў час дажджу і псаваць іх. Таксама ў чэрвені варта падрыхтаваць жэрдкі для ўстаноўкі іх у ліпені пад галіны пладовых культур з вялікай колькасцю пладоў.

Калі ёсць неабходнасць восенню пасадзіць новыя пладовыя дрэвы, то самы час у чэрвені прыступіць да падрыхтоўкі пасадачных ям. Для грушы і яблыні дыяметр ям складае 1 метр, а глыбіня — 0,6 метра для слівы, вішні, абляпіхі — 80х50 сантыметраў. У ніжнюю частку ямы трэба закласці звычайную дзярновую зямлю і змяшаць яе з суперфасфатам. 300 г для костачкавых культур і 600 г для семечкавых. У якасці калійных угнаенняў можна прымяніць драўнянны попел. Зверху ў яму ўносяць торф — 5—7 вёдраў і перагной — 1-2 вядры. Усе гэтыя ўгнаенні трэба змяшаць з урадлівай глебай і запоўніць ёй яму. Якраз да восені глеба ў яме асядзе і малавераготна будзе дапусціць памылку па заглыбленні набытых саджанцаў.

На маліне ў гэты час з'яўляецца багата парасткаў. Можна пакінуць самыя буйныя, размешчаныя ўздоўж асноўнага раду, а астатнія трэба зрэзаць пры дапамозе вострай матыкі.

# ЛЕПШЫ ПАЖЫТАК ДЛЯ МАЗГОЎ

**Наш пастаянны чытач Мікалай Іваноў з вёскі Зеляней Карэліцкага раёна папрасіў падрабязна расказаць пра сачавіцу: як вырошчваць і спажываць. З задавальненнем выконваем просьбу.**

Сачавіца была апісана ў працах Герадота. Яна лічылася адной з самых любімых страў у Егіпце, дзе яе гатавалі ў выглядзе кашы, запраўленай алеем і цыбуляй. З сачавіцы рабілі прэсныя аладкі, яны былі вельмі запатрабаваны ў вандроўнікаў падчас падарожжаў. У гонар сачавіцы называлі вуліцы і гарады. За талерку сачавічнай поліўкі біблейскі Ісаў прадаў малодшаму брату сваё першародства. Сачавічнае насенне знаходзілі на раскопках старажытнай Троі. За тысячы гадоў не змянілася форма насення сачавіцы. Сёння яно стала толькі большага памеру і лепшага смаку.

Сачавіца адносіцца да сямейства бабовых, у ёй змяшчаецца вялікая колькасць бялку, які і абумоўлівае высокую пажыўнасць страў. Бялкоў у сачавіцы — да 35%, крухмалу — да 60%. Бялок сачавіцы засвойваецца арганізмам добра і змяшчае дастатковую колькасць жыццёва неабходных амінакіслот. Па суме амінакіслот бялок сачавіцы стаіць нароўні з бялком лепшых катэгорый мяса. Па смакавых і пажыўных якасцях сачавіца займае адно з першых месцаў сярод збожжавых бабовых культур. Яна разварваецца лепш, чым іншыя бабовыя, мае больш тонкі і прыемны смак. Сачавіца лічыцца экалагічна чыстым прадуктам, бо не назапашвае ў сабе радыенуклідаў, нітратаў і іншых таксічных элементаў падчас росту.

Сачавіца ўяўляе сабой аднагадовую расліну з добра развітай і разгалінаванай каранёвай сістэмай. У залежнасці ад некаторых фактараў і гатунку вышыня гэтай расліны — 15-75 сантыметраў. Лісты складаныя, з невялікімі вусікамі на канцах. Бабы маюць невялікія памеры і круглявую, трохі пляскатую форму.

Перыяд вегетацыі доўжыцца ад двух да чатырох месяцаў — у залежнасці ад глебы, гатунку і кліматычных умоў. Праз тыдзень пасля пасеву з'яўляюцца першыя ўсходы. Сачавіца да наступлення перыяду цвіцення развіваецца вельмі павольна. Але пасля з'яўлення першых кветак расліна пачынае хутка расці.

Насенне сачавіцы прарастае пры тэмпературы 4 градусы, для ўсходаў гэтай культуры не страшныя невялікія замаразкі. Аптымальная тэмпература для росту — 18-22 градусы. Сачавіца даволі ўстойлівая да засухі, але ўсё ж пажадана рэгулярна ўвільгатняць глебу. Неабходна і рэгулярная праполка, інакш ураджай будзе не зусім добрым. Для вырошчвання гэтай бабовай культуры падыходзяць суглінкавая і супясчаная рыхлая глеба. Пры пасадцы ў кіслую і цяжкую глебу культура дасць дрэнны ўраджай. Сачавіца — самаапыляльнік. Прапашныя і азімыя культуры лепш за ўсё падыходзяць у якасці папярэднікаў для сачавіцы. На прысядзібным участку яе лепш за ўсё сеяць пасля бульбы. У сваю чаргу сачавіца з'яўляецца добрым папярэднікам для многіх культур, паколькі ўзбагачае глебу азотам за кошт фіксацыі яго з паветра. Яна таксама пакідае пасля сябе глебу чыстай ад пустазелля і ў добрым стане. Не выкарыстоўвайце для ўгнойвання сачавіцы гной, бо пры гэтым яна развівае вялікую зялёную масу і зніжае ўраджай зерня. Для гэтых мэт больш падыдуць калійныя і фосфарныя ўгнаенні, якія неабходна ўносіць у глебу падчас вясновай і восеньскай перакопкі. У час сяўбы ўносьце гранул яваны суперфасфат.



Сеяць сачавіцу можна пры тэмпературы глебы 5-6 градусаў, глыбіня пасеву — 5-6 сантыметраў. Адлегласць паміж радкамі пры высаджванні бабовай культуры — 10-15 сантыметраў. Пасля пасадкі трэба прыкачаць глебу — гэта дасць больш моцныя ўсходы. Для знішчэння пустазелля сачавіцу барануюць пасля з'яўлення ўсходаў, але абавязкова ў паўдзённы час, калі расліны не такія далікатныя, як раніцай.

Бабы спеюць нераўнамерна — спачатку ніжнія, а затым верхнія. Убіраюць сачавіцу, калі ніжнія бабы пабурэюць і пачнуць растрэсквацца. Лепш за ўсё рабіць гэта раніцай. Зрэзаныя расліны ўкладваюць на раскладзенае палатно ў



кучкі пад яркім сонцам. Да вечара пасля невялікага абмалоту — паляпвання рукой па кучы — збіраюць насенне, якое аддзялілася. Абмалот праз 3-4 дні паўтараюць. Да гэтага часу верхнія бабы ўжо пачынаюць растрэсквацца. У ежу ўжываюць зерне не толькі ў поўнай спеласці, але і недаспелае, яно лічыцца нават смачнейшым.

Сачавіцу лічаць гаючай раслінай: адвар яе рэкамендуюць прымаць пры ырачнакаменнай хваробе. Сумесь мукі сачавіцы са сметанковым маслам часам ужываюць для лячэння апёкаў, а з яечным жаўткам — для лячэння ран. Старажытныя рымляне называлі сачавіцу лекамі для «душэўнай раўнавагі». Зараз сачавіцу бяруць на ўзбраенне ўрачы-дыетолагі, бо яна вельмі карысная дзецям, пажылым людзям, дыябетыкам. Яе рэкамендуюць пры сардэчна-сасудзістых захворваннях, анеміі. Медыкі рэкамендуюць з'ядаць за год каля 2,5 кг сачавіцы. З зерня сачавіцы гатуюць вядомую поліўку, а таксама начынку для пірагоў. У сумесі з рысам або іншымі крупамі сачавіца — добры гарнір для розных страў.

Перад варкай сачавіцу можна не замочваць, варыць 30-45 хвілін. Гатаваць можна гарніры, супы, аладкі, кашы. Сачавічны паштэт па колеры і смаку вельмі падобны на мясны.

**Салата з сачавіцы.** Сачавіцу прамыць і зварыць да гатоўнасці, адкінуць на друшляк і астудзіць. Сырую моркву і яблыкі нацерці на буйной тарцы, вараныя буракі парэзаць на дробныя кавалачкі і ўсё змяшаць з сачавіцай. Дадаць цукар, лімонную цэдру або сок, соль, перац, заправіць смятанай або маянэзам.

**Суп з сачавіцы.** Прамытую сачавіцу апускаюць у кастулю з халоднай вадой і вараць, праз паўгадзіны дадаюць масла або алей (палову прадугледжанай колькасці), нарэзаныя кубікамі моркву і сельдэрэй, часнок, чабор і соль. Праз 10-15 хвілін дадаюць дробна нарэзаныя памідоры. У тлушчы, які застаўся, падсмажваюць дробна нарэзаную цыбулю. Пры бесперапынным памешванні дадаюць да яе муку, разведзеную ў невялікай колькасці вады, таматную пасту і чырвоны перац. Гэтую запраўку ўліваюць у суп і вараць яшчэ 10 хвілін.

**Пюрэ з сачавіцы.** Зварыць сачавіцу на слабым агні да гатоўнасці, астатнюю ваду зліць, пасаліць. Прапусціць праз мясарубку або працерці праз сіта, дадаць дробна нарэзаную і падсмажаную на алеі цыбулю і ўсё змяшаць.

**Начынка з сачавіцы** для піражкоў. Зварыць прамытую сачавіцу да мяккасці, прапусціць праз мясарубку, змяшаць з пасераванай у алеі цыбуляй, пасаліць, дадаць на смак перац і дробна пасечаны часнок.

Добрая сачавіца і ў якасці кармавой культуры. На корм жывёле ідзе зялёная маса раслін, насенне, салома.

■ Крытыка на шпільцы

# Смачны чытацкі сняданак



Адна знаёмая дзяўчына, атрымаўшы гуманітарную адукацыю, доўга шукала працу. І ад безвыходнасці стала круп'е ў новаадкрытым казіно. Яе замалёўкі пра побыт і норавы гэтай установы так уразілі мяне, што я неаднойчы прасіла зрабіць з іх мастацкі твор — настолькі нечаканы і безумоўна новы матэрыял уяўлялі з сябе яе аповеды пра нябачны спод ігральнай індустрыі. Тым больш што дзяўчына мела трапнае вока назіральніка і чорны гумар чалавека, вымушанага працаваць па начах.

Як даўняму аматару вытворчых раманаў Артура Хэйлі «Аэрапорт», «Атэль» і інш., мне вельмі хацелася, каб нешта падобнае з'явілася і ў беларускай літаратуры. Тым больш што для большасці з нас таямніцы бізнесу — усё яшчэ таямніцы. І якое ж было маё здзіўленне, калі я ўзяла ў рукі параўнальна невялікую, густоўна выдадзеную кнігу «Кантынентальны сняданак» Сяргея Календы. Гэты зборнік прозы аказаўся самым што ні ёсць тыповым вытворчым раманам пра атэль, цікавым не менш, чым вядомы хэйлеўскі твор!

Некалькі гадоў таму я ўжо пісала ў «Звяздзе» пра Сяргея Календу, адзначаючы яго першую кнігу як лепшы дэбют года. З той пары прайшло зусім мала часу, а гэты аўтар паспеў выдаць не толькі некалькі ўласных кніг, але і пару-тройку літаратурных альманахаў. Шчыра кажучы, падазрона стаўлюся да падобнай пісьменніцкай пладавітасці, бо даўно лічу, што сучасная проза пакутуе менавіта праз недапрацоўку цяперашніх літаратараў, якія хапаюцца за выратавальную саломінку ўспамінаў і аўтарэфлексій.

Але кніга Календы «Кантынентальны сняданак» прымусіла мяне памяняць свой погляд на літаратурныя суадносіны колькасці і якасці. Артур Хэйлі ж выдаткоўваў на напісанне сваіх раманаў роўна паўтара года, што ніякім чынам не адбілася на яго папулярнасці, нягледзячы на ўсе шпількі крытыкаў адносна такой працаздольнасці.

Такое ўражанне, што наш малады аўтар таксама ўзяў на ўзбраенне творчы метад канадскага пісьменніка — выяўляць «крызіс сярэдняга характару, які выкліканы неспакоем, скокамі настрою, і выкарыстоўваць яго ў паралельных лініях». Але паколькі ўсё напісана на арыгінальным беларускім матэрыяле, дзе пазнаецца — нягледзячы на папярэджанне аўтара пра выпадковасць любых супадзенняў — літаральна ўсё і ўсе, чытаць кнігу надзвычай цікава. Нягледзячы на тое, што ў творы не згадваецца ні назва атэля, ні імёны вядомых пастаяльцаў, асабіста я разумела і выдатна ўяўляла ўсе падзеі, апісаныя ў «Кантынентальным сняданку», кнізе, якую аўтар прысвяціў ўсім:

*«хто выдаткоўвае сваё жыццё*
*на карысць іншых людзей,*
*хто гатуе для чужынцаў, хто мые й*
*прасуе чужыя брудныя анучы,*
*хто засцілае чужыя ложкі,*
*хто пыласосіць і мые пакоі*
*для незнаёмцаў,*
*хто стрыжэ ім валасы,*
*хто робіць ім масаж,*
*хто пільнуе людзей у басейнах*
*і фітнэс-залях,*
*каб ніхто не надарваўся,*
*усім, хто робіць жыццё*
*ў незнаёмай краіне*
*цікавым і ўтульным».*

Гісторыі пра жыццё гатэля вядуцца ад імя парцье, але, чытаючы тэкст, не перастаеш лавіць сябе на думцы, што аўтар рэальна сам паспрабаваў усе тыя прафесіі, пра якія ён з такой ашаламляльнай падрабязнасцю піша. Усе — ад усемагутнага дырэктара да затурканай прыбірачкі.

«...падмятаць падлогу пасля вячэраў, прыбіраць посуд; выціраць пыл, які на дзевяноста адсоткаў складзены з адлушчанай скуры пастаяльца; пыласосіць паўсюль выпаўшыя валасы з галавы, з лабка, з-пад пахі; адмываць рукамыйнік пасля дэпіляцыі, галення, падстрыгання пазногцяў; адшкрабаць адусюль кроплі тлушчу, зубной пасты, крыві, мачы; з люстэрка выціраць плямкі з-пад выціснутых прышчоў з твараў і спінаў; мыць вокны пасля дажджу звонку, знутры — выціраць тлустыя адбіткі пальцаў...»

Нават цяжка сказаць, што больш уражвае ў кнізе: засяроджанае, амаль навуковае разуменне чалавечай псіхалогіі, жывая гутарковая нязмушаная ўмоўнасцямі мова, ці вось гэтыя нетыповыя для сучасных пісьменнікаў веды аб працы людзей, якіх мы звычайна проста не заўважаем.

Чыста тэарэтычна можна ўявіць, што кожны можа прымераць на сябе ролю маркетолага ці ахоўніка буйнога дарагога атэля... А вось паказаць працу пакаёўкі так, што навекі вечныя чытач адчуе і зразумее ўвесь псіхалагічны цяжар гэтага занятку — гэта трэба мець пільны погляд і шчымлівую любоў да «бедных людзей», якіх Календа паказвае ў лепшых традыцыях Дастаеўскага і Чэхава.

Цікавым падаецца і той момант, што, нягледзячы на тое, што кніга пісалася хутка, структура яе вельмі пругкая, трывалая, з выразным пралогам і эпілогам. Разам з тым асобныя раздзелы чытаць абсалютна самастойна, як апавяданні. Трагікамічныя сітуацыі, у якія трапляюць героі Календы, здзіўляюць тым, наколькі моцна выяўляюць нацыянальны беларускі характар, які яскрава высвечваецца праз параўнанне з паводзінамі замежных гасцей. І хоць Календзе можна зрабіць закід і ў адсутнасці еўрапейскай паліткарэктнасці, талерантнасці, якой мы звычайна так ганарымся, і ў тым, што мова яго поўная вульгарызмаў і ў тым, што тэксты яго іншым разам засяроджаны на горшых чалавечых заганах, але яго любоў да простага чалавека, іронія да сённяшніх гламурна-глабальных каштоўнасцяў і глыбокае разуменне душы беларускай робіць кнігу «Кантынентальны сняданак» адной з самых яскравых і запамінальных кніг пра сучаснасць.

**Ганна КІСЛІЦЫНА.**

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ. г. Дзяржынск.



## «ЧЭРВЕНЬ — З ЯГАДНАЮ ЗАРОЙ»

**Па гарызанталі: 1.** ..., або Сёмуха. Свята, асаблівасцямі якога з'яўляліся карагоды, пляценне вянкоў, упрыгожванне хаты зелянінай. **4.** «Травень — з першым каханнем, сяўбой,\\... — з ягаднаю зарой». З верша «Родная мова» П.Панчанкі. **8.** На тое ... : каго й умелага ўкруціць, а каго й няўмелага на бераг вынясе (прык.). **9.** Калі ў першыя два дні чэрвеня ліе дождж, увесь ... будзе сухі (прыкм.). **12.** «Ідуць касцы, ідуць, як хмары\\І льецца ... іх разудалы». З паэмы «Новая зямля» («Летнім часам») Я. Коласа. **13.** Прыйшоў ... (22 чэрвеня) — дасявай гуркі хутчэй (прык.). **17.** Прыродная мінеральная фарба. **18.** Грамадскае акружэнне, асяроддзе. **19.** «Мільённых цягнуцца ...,\\ Дзе дрэмле купальскі курган». З верша «Заклятая кветка» Я. Купалы. **20.** ... ды лебяда — для палетку бяда (прык.). **23.** Тое, што і давер'е. **24.** Час уборкі збожжавых культур. **29.** «Стукі, стук, стук, ...!\\Кляпі коску, мужычок». З верша «Касцу» Я.Купалы. **31.** Як ... косяць, дык дажджу не просяць (прык.). **33.** Хвост ды ... — глядзець міла, а ў гразі хоць сам вязі (прык.). **34.** Калі запяе удод, тады сей ...(прык.). **35.** Свята беларускага народнага календара (25 чэрвеня). «Хто на Нупрэя пасее грэч, той будзе бліны печ» (прык.). **36.** Не той ..., што з вуды сарваўся, а той, што ў вядры застаўся (прык.).

**Па вертыкалі: 2.** На Тодара (21 чэрвеня)... — канапель паласа (прык.). **3.** Завяршэнне чаго-небудзь. **5.** Злак з белым зернем. **6.** Паляўнічы-прафесіянал. **7.** Ісакій- ... . Прысвятак, які прыпадае на 12 чэрвеня; лічылася, што з гэтага дня выпаўзаюць з нор гадзюкі і ладзяць свае «вяселлі». **10.** Не глядзі мяжы ды ... садзі (прык.). **11.** Слухай, дуброва, што ... гаворыць (прык.). **14.** «Пахне павабна ... над ракой». З верша «Лета» Я. Купалы. **15.** Елісей — ... . Святы, пакутнік, дзень якога адзначаўся 27 чэрвеня; лічылася, што ў гэты дзень заканчвалі сеяць грэчку. **16.** ... Полацкая. Беларуская асветніца, святая; яе дзень адзначаецца 5 чэрвеня. **21.** ... -ураджайнік. Святы, дзень якога адзначалі 20 чэрвеня; з гэтага дня пачыналі вычышчаць гной з хлява. **22.** На Яўціхія (10 чэрвеня) дзень ціхі — добры ...(прык.). **25.** Мужыку лета, што святому ...(прык.). **26.** Чырвонае лета — зялёны ...(прык.). **27.** Калі ... сухі, купляй пчолку, а калі мокры — кароўку (прыкм.). **28.** ... праляжыш, то ўзімку ў пазыку пабяжыш (прык.). **30.** Збожжавая расліна; лічылася, што ... пачынае каласіцца з Фядоссі-каласяніцы (11 чэрвеня). **32.** Травяністая расліна з прыемным вострым пахам.

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**
**Па гарызанталі:** 1. Тройца. 4. Чэрвень. 8. Вір. 9. Месяц. 12. Смех. 13. Фалалей. 17. Вохра. 18. Сфера. 19. Рукі. 20. Асот. 23. Давер. 24. Жніва. 29. Малаток. 31. Сена. 33. Грыва. 34. Боб. 35. Анапрэй. 36. Шчупак.
**Па вертыкалі:** 2. Раса. 3. Фінал. 5. Рыс. 6. Егер. 7. Змеявік. 10. Сад. 11. Лес. 14. Трава. 15. Грэчкасей. 16. Ефрасіння. 21. Фядот. 22. Ураджай. 25. Рай. 26. Пакос. 27. Год. 28. Лета. 30. Жыта. 32. Аер.

■ Цікавая вестка

## ВНУ ЦАЛКАМ ПЯРОЙДЗЕ НА ВЫКАРЫСТАННЕ СОНЕЧНАЙ ЭНЕРГІІ

**Выкарыстоўваць выключна энергію нябеснага свяціла неўзабаве пачне адна са сталічных ВНУ.**

Як паведаміў **дырэктар «Галоўэнерга» Дзмітрый МІЦКЕВІЧ,** назва навучальнай установы пакуль трымаецца ў сакрэце. Аднак гэтая ВНУ стане першай у сталіцы, якая цалкам пяройдзе на выкарыстанне альтэрнатыўнай энергіі. Цяпер ўстанова спажывае нязначны аб'ём электрычнасці. Таму энергіі, якую атрымаюць ад сонца, будзе цалкам дастаткова, каб абслугоўваць гэты будынак.

— На даху будынка ўжо ўсталяваны 153 сонечныя батарэі. Працаваць яны будуць нават узімку, паколькі сілкуюцца не ад цяпла, а ад святла. У хуткім часе спецыялісты маюць намер іх падключыць, — удакладніў суразмоўца.

Д. Міцкевіч таксама дадаў, што пайсці на такія захады кіраўніцтва ВНУ вырашыла дзеля эканоміі грашовых сродкаў. Раней на звычайную электраэнергію трацілі мільёны рублёў. Цяпер ток у разетцы для арганізацыі будзе каштаваць танней.

— У бліжэйшы час мы рыхтуемся ўсталяваць сонечныя батарэі яшчэ на двух будынках іншых прадпрыемстваў.

**«Мінск—Навіны»**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 4.40 | 21.37 | 16.57 |
| Віцебск | 4.22 | 21.34 | 17.12 |
| Магілёў | 4.30 | 21.27 | 16.57 |
| Гомель | 4.36 | 21.14 | 16.38 |
| Гродна | 4.57 | 21.50 | 16.53 |
| Брэст | 5.07 | 21.42 | 16.35 |

### Месяц

***Маладзік 8 чэрвеня. Месяц у сузор'і Цяльца.***

### Імяніны

***Пр.** Івана, Калініка, Мікіты, Сцяпана, Сямёна, Фёдара.*
***К.** Марыі, Паўліны, Лаўрэнція, Нікіфара, Норберта, Сымона.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

У краме:
— Які ў вас цікавы веласіпед!
— Гэта веласіпед-тандэм. Вы можаце на ім удваіх ехаць са сваёй жонкай!
— Мая жонка не ўмее ездзіць на веласіпедзе!
— Дык гэта якраз ваш выпадак! Яна будзе ззаду проста круціць педалі!
— І праўда, цікава. Скажыце, а пярэднія педалі можна прыбраць?

**— Што робіш?**
**— Бліны ем з варэннем...**
**— Ты ж на дыеце была?**
**— А я іх гарбатай для пахудзення запіваю!**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 24.112. Індэкс 63850. Зак. № 2492.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 5 чэрвеня 2013 года.